№ 32 (486) 1 верасьня 2006 www.nn.by

# Наша Ніва

ПЕРШАЯ БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЭТА

ISSN 1819-1614

Заснаваная ў лістападзе1906. Адноўленая ў траўні 1991. Выдавец: Фонд выданьня газэты «Наша Ніва». Выходзіць штотыднёва, у пятніцы

## Мілінкевіч: рэфэрэндум недапушчальны

Аляксандар Мілінкевіч на сустрэчы з прадстаўнікамі дыпляматычнага корпусу: «Рэфэрэндум аб «канстытуцыйным акце» прывядзе да зьнікненьня Беларусі з карты сьвету». **Старонка 7.**

## Замежная дапамога апазыцыі: Vox populi

Сродкі, якія атрымлівае апазыцыя ад дабрадзеяў, гэта не *падачка.* Ліст Міколы Бусла. **Старонка 5.**

## Чорны жнівень

Шэраг трагічных здарэньняў з удзелам беларусаў, вымушаных зарабляць за мяжой. **Старонка 7.**

## Пісьменьнікі здалі Дом літаратара бяз бою

Заклік Вольгі Іпатавай да супраціўленьня ня быў пачуты. **Старонка 17.**

## Чалавек Плошчы, ня дай сябе зламіць

Мы паспыталі ў рэальнасьці тое, што нашы аднагодкі на Захадзе маюць у сурагатнай форме. Піша Андрэй Баранаў. **Старонка 31.**

# У якой краіне мы жывём?




АНДРУСЬ ШПАКАЎ



ЛЕЛІК УШКІН

**Ь: Што, нэрвуесься? А я табе яшчэ ў 1933 годзе казаў, што рана радавацца.**

## Лукашэнка і Радзькоў мяняюць правапіс. Нашто?

Права на правапіс. **Старонка 8.**

Інтэрвію з распрацоўшчыкам новых нормаў Аляксандрам Лукашанцам: «Ня ведаю, ці забароняць тарашкевіцу...», «...але асабіста я забараніў бы». **Старонка 9.**

Прынцыпы «лукаш*а/*энкаўкі». **Старонка 11.**

Артаграфія вершаў Быкава. **Старонка 11.**




# У нумары

## водгукі і камэнтары


У якой краіне мы жывём? ..... 4

Замежная дапамога апазыцыі: Vox populi ..... 5

Маці маладафронтаўцаў адказваюць С.Семенюку і В.Радзьку ..... 5

Алесь Аркуш. Замежжа — наш саюзьнік і база ..... 5

Аляксандар Фядута. Два словы пра Мілінкевіча–малодшага ..... 6

Лявон Баршчэўскі. Троечнік і ў Польшчы троечнік ..... 6

Віталь Тарас. Няма мовы ..... 12

Андрэй Баранаў. Чалавек Плошчы, ня дай сябе зламіць ..... 31

Павал Севярынец. Малое Сітна ад Рагвалода да Мілінкевіча ..... 32


## люстра дзён


Чорны жнівень ..... 8

Мілінкевіч: рэфэрэндум недапушчальны ..... 8

Пазоў на 30 мільёнаў супраць газэты «Товарищ» ..... 8

Права на правапіс ..... 8

Чаму «ўпарадкаваньне правапісу» выклікае непакой ..... 8

Выдаўцы гатовыя бараніць клясычны правапіс ..... 8

Аляксандар Лукашанец: «Ня ведаю, ці забароняць тарашкевіцу» ..... 9

Прынцыпы «лукаша/энкаўкі» ..... 11

Артаграфія вершаў Быкава 11

Хроніка ..... 32


## аб усім патроху


Мілінкевіч: «З майго сына павінны патрабаваць, як зь любых іншых» ..... 14

Івашкевіч: «Кандыдаты на мясцовых выбарах хай стануць дэлегатамі новага Кангрэсу» ..... 14

Пачатак новага палітычнага сэзону ..... 14

Для беларусаў выдадуць куцаватую Windows? ..... 5

Плютон болей не плянэта ..... 15

Гілевіч, Законьнікаў, Пашкевіч атрымалі ўзнагароды Украіны ..... 15

Сустрэліся сябры Саюзу беларускіх патрыётаў ..... 16

Эгіпцяне падкапаліся пад дзьве беларускія мяжы ..... 16

15 тысяч турыстаў штомесяц у Міры ..... 16

Выйшаў новы «Дзеяслоў» ..... 16

Генадзю Бураўкіну — 70 .. 16


## культура


Свая азбука ..... 21

Маштабная рэклямная акцыя з дазволу Адміністрацыі прэзыдэнта ..... 34

«N.R.M.» у Маладэчне ..... 35

Народных шмат, любімы — адзін ..... 36

Сокал–Кутылоўскі без акуляраў ..... 37

Я за ўсімі ўладамі сядзеў ..... 38

У пошуках скрыпкі Агінскага ..... 40


## вольны час


Гістарычная песьня 8 верасьня ..... 42

Аршанская бітва — 2006 . 43

Што ў Драгічыне ..... 45


## левым вокам


«Наша Ніва — Советская Белоруссия». Гумарэска Лёліка Ушкіна ..... 17


## калі б...


Малюнкі Лёліка Ушкіна .... 47


# Прэмія імя Завадзкага нашаніўцам

**Юлія Дарашкевіч** і **Андрэй Дынько** сталі ляўрэатамі прэміі «За мужнасьць і прафэсіяналізм».

30 жніўня расейскі Першы канал і Беларуская асацыяцыя журналістаў абвесьцілі імёны ляўрэатаў прэміі «За мужнасьць і прафэсіяналізм» імя Зьмітра Завадзкага за 2006 год. Яе ўладальнікамі сталі галоўны рэдактар «Нашай Нівы» А.Дынько, фотакарэспандэнтка газэты Ю.Дарашкевіч, журналіст «Комсомольской правды» в Белоруссии» Алег Улевіч.

Нагадаем, што А.Дынько адседзеў у сакавіку 10 сутак на Акрэсьціна. Ю.Дарашкевіч мужна выконвае свае прафэсійныя абавязкі, нягледзячы на шматлікія перашкоды з боку праваахоўных органаў. А.Улевіча жорстка зьбілі 2 сакавіка ля сьценаў Кастрычніцкага РУУС Менску падчас асьвятленьня затрыманьня кандыдата ў прэзыдэнты А.Казуліна.

**Юлія Дарашкевіч:**

«Гэты год быў насычаны падзеямі, як станоўчымі, так і ня вельмі. Было шмат працы для журналістаў. Мне прыемна, што сярод мноства калегаў менавіта маю працу заўважылі і ацанілі».

**Андрэй Дынько:**

«Каб жа Першы канал яшчэ пра Беларусь паведамляў нармальна... Гэтую прэмію прысуджае журналісцкі калектыў каналу. І выбар ляўрэатаў — фактычна выказ нязгоды журналістаў з рэдакцыйнай палітыкай каналу. Дзякуй ім за салідарнасьць. Хай гэтая прэмія пакладзецца цаглінай у падмурак будучых, новых адносінаў свабоднай Расеі з свабоднай Беларусьсю».

**Даведка «Нашай Нівы»**

Прэмія «За мужнасьць і прафэсіяналізм» імя Зьмітра Завадзкага была заснавана ў 2002 г. у памяць зьніклага 7 ліпеня 2000 г. апэратара ОРТ супрацоўнікамі каналу (цяпер — Першы канал). Пазьней да вызначэньня кандыдатаў далучылася Беларуская асацыяцыя журналістаў. Уручаецца журналістам, што працуюць у Беларусі.

Прэмія ня мае грашовага вымярэньня і ўяўляе сабою выяву лінзы аб'ектыва камэры на чорнай падстаўцы.

Цырымонія ўзнагароджваньня пройдзе ў пачатку верасьня.







У свой час

# Эдвард Вайніловіч

# Магдалена Радзівіл

# Васіль Быкаў

# **ахвяравалі на «Нашу Ніву»**

з пачатку 2006 году
газэта атрымала
6000 ахвяраваньняў
з усіх куткоў Беларусі.
Дзякуй!




ЮЛІЯ ДАРАШКЕВІЧ

**Каля 6000 чалавек наведалі канцэрт «Песьні Свабоды».**

# У якой краіне мы жывём?

Уражаньні ад канцэрту 25 жніўня сапсавала забарона ўздымаць бел-чырвона-белыя сьцягі.

Хачу распавесьці пра свае ўражаньні ад канцэрту «Песьні Свабоды» 25 жніўня. «Сьвята як сьвята: цыгарэты, піва...» Колькі ні прасілі арганізатары аб неўжываньні алькаголю — усё роўна сустракаліся купкі маладзёнаў зь півам у руках. Прасілі, каб не ўздымалі Сьцягоў, але мы вырашылі пад канец канцэрту на выступе «N.R.M.» падняць... і паднялі. Да нас адразу падляцелі «дружыньнікі» з «Моладзі БНФ» і папрасілі іх прыбраць, матывуючы тым, што арганізатары будуць за тое пакараныя, як на Чарнобыльскім шляху — 2006. Але пагаджаліся з тым, што гэта Наш Сьцяг, і сыходзілі. Праз хвілінаў пяць да нас ізноў падбеглі некалькі чалавек, і паспрабавалі адабраць Штандары, і гаварылі па-расейску, на што атрымалі адказ: «Едзьце ў Маскву! Вы дзе жывяце? Хавайцеся ў бульбу!» Потым цэлай калодай наляцелі на аднаго з салігорскіх хлопцаў і пачалі з ужываньнем фізычнай сілы адбіраць Сьцяг, але пралічыліся і атрымалі ў адказ... Падчас сутычкі нехта з «дружыньнікаў» пасьпеў цішком забраць і схаваць Палотнішча, але хлопцу Яго потым вярнулі. Знайшліся таксама людзі, якія падтрымалі нас. Урэшце, настрой быў сапсаваны. Хацелася б выказацца адносна «арганізатараў» і «дружыны». Калі вы хочаце арганізаваць сапраўднае Сьвята Незалежнасьці, то ня трэба дрыжаць за сваю пятую кропку, ці не бярыцеся ўвогуле. Бо з такім посьпехам я ўключу дома дыск «Песьні Свабоды» і буду махаць Сьцягам. Сорамна, калі не ПМСН, а «свае людзі» адбіраюць наш Сьцяг! Для чалавека, які прайшоў Плошчу, разгоны, пагрозы і допыты — гэта, па меншай меры, абраза!!! За100емся!

**Глеб, Салігорск**

Вось як тлумачаць сытуацыю арганізатары канцэрту на сайце za-svabodu.org. «Адмоўны момант канцэрту — «сьцягавы шантаж» з боку міліцыі. Зьвязаны ён быў ня гэтулькі з магчымымі затрыманьнямі, як паведамілі СМІ, а з тым, што міліцыянты «ўзялі ў закладнікі» электрычнасьць. Сярод арганізатараў не было адназначнага меркаваньня: ці ісьці на прынцыповую канфрантацыю і спыняць канцэрт, ці працягваць яго. Аднак пасьля кансультацыяў з музыкамі, якія нячаста маюць магчымасьць выступіць перад публікай, было прынятае рашэньне: «сьцягі на плечы», г.зн. не выкарыстоўваць тронкаў, а накідваць нацыянальную сымболіку на сябе альбо трымаць у руках.

Шкада, але гэта відавочна не праблема канцэрту, а праблема ўсёй нашай краіны. І для ўсіх нас гэта мусіць стаць дадатковым стымулам для барацьбы супраць антысвабоднай і процібеларускай улады ў Беларусі».

# Замежная дапамога апазыцыі: Vox populi

**У №30 вельмішаноўны В.Тарас дапусьціў прыкрую памылку.**

У артыкуле «Незалежнасьць за даляглядам» на с. 9, сярэдні слупок, ён ужыў фразу «На падачках (будзем называць рэчы сваімі імёнамі) Захаду?», кажучы пра прынцыпы, на якіх яднаецца апазыцыя.

Па-першае, сам У.Ленін «любіў цытаваць Чарнышэўскага, які казаў: «Палітычная барацьба — не тратуар Неўскага праспэкту». Даводзіцца і па брудзе пахадзіць часам». Параўнай неаднаразовае выказваньне гаранта Канстытуцыі: «Паліціка — дзела гразнае».

Па-другое, сродкі, якія даюць апазыцыі дабрадзеі, гэта не *падачка*. Гэта звычайная ў сучасным сьвеце практыка салідарнасьці.

Пасьля сьмерці Ф.Франка ў Гішпаніі пачаўся буйны рост грамадзянскай актыўнасьці і фармаваньня партыяў. Практычна ўсе партыі мусілі быць за мяжою пры фанкізьме.

Дык вось, камуністы мелі сродкі ад Румыніі, НДР, Паўночнай Карэі (з Саветамі пасварыліся). Баварская ХДС практычна ўзяла на сябе ўсе выдаткі ва ўтварэньні таго, што сёньня завецца Партыда папуляр — Народная партыя. Дапамога была пераважна ў форме навучаньня і матэрыяльных рэсурсах. Сацыял-дэмакраты Эўропы дружна падтрымалі Гішпанскую сацыялістычную рабочую партыю — яна атрымала сродкаў разоў у пяць болей за астатніх. І нікому ў галаву не ўзбрыло называць гэта падачкамі.

Ва ўмовах Беларусі лічыць дапамогу сяброў падачкамі — недапушчальнае глупства, выгаднае толькі ворагам дэмакратыі і волі. (Магчыма, хіба, казаць пра больш эфэктыўнае выкарыстаньне сродкаў, я тут ня дока.)

Вядома, «падачак з Захаду» можна і ня браць, але тады трэ запісацца ў ведамасьць на падачку да рэжыму. Сп.Віталь, пэўне, узгадвае, як наш кіраўнік сталіўся на бізнэсоўцаў: «Божа крый, вы капеечку дасьце апазыцыі!»

Вандальнае абрабаваньне Саюзу беларускіх пісьменьнікаў, цынічная расправа з апазыцыйнай моладзьдзю, таптаньне па беларушчыне паказвае, што мы маем справу з антыбеларускай антыцывілізацыйнай пачварай, і змаганьне зь ёю — справа ўсяго прагрэсіўнага люду.

І калі гэты прагрэсіўны люд дае прагрэсіўныя грошы, то нельга называць іх падачкаю, бо ў такім выпадку мы, праціўнікі рэжыму, ператвараемся ў няўдзячных люмпэнаў-валацуг, кім мы, бясспрэчна, ніколі не былі і ня будзем.

Так што сп.В.Тарас з кулацкай званіцы лінуў вадзіцы на чужы млын.

Зазначу, што ў вёсцы, дзе я жыву, ёсьць ладная колькасьць асоб, якія шчыра вераць, што мне, ненавісьніку таталітарызму, спраўна плацяць даляры.

Цяперака іхняя вера можа падрасьці.

**Мікола Бусел, Дуброва (Сьветлагоршчына)**

# Маці маладафронтаўцаў адказваюць С.Семенюку і В.Радзьку

**В.Радзько ці С.Семянюк (№28, 31) закранаюць праграму К.Каліноўскага і дзейнасьць Грамадзкага камітэту абароны рэпрэсаваных. Хай бы яны паглядзелі нам, маці, у вочы і спыталі, ці хочам мы сваіх сыноў аддаваць у турму, як «партнэрцаў», ці на «хімію»?**

Яны ведаюць, колькі нам, матулям, бабулям гіпэртаніяў і стэнакардыяў каштуюць гэтыя крымінальныя справы? Ці хочам мы нашых дарагіх, разумных, таленавітых, натхнёных хлопчыкаў і дзяўчат аддаваць у жэрла гэтай ненасытнай рэпрэсіўнай машыны, заведзенай яшчэ са сталінскага часу? Ці можам мы з гэтым зьмірыцца?

Вось таму сабраліся бацькі яшчэ ў сакавіку пад сьценамі Акрэсьціна, згуртаваліся, каб абараніць дзяцей, лепшую моладзь, падумаць, што мы можам разам зрабіць. Так паўстаў Камітэт. Другія бацькі сабраліся ў Жодзіна ля муроў вязьніцы. Бацькі зарганізаваліся, іх ініцыятыву падтрымалі лідэры дэмакратычнай апазыцыі. Дзякуючы свайму аўтарытэту ў Эўропе, Іна Кулей і Аляксандар Мілінкевіч дамагліся атрымаць стыпэндыі і для беларускіх юнакоў і падпісалі пагадненьне з польскім урадам. Гэта мы прымаем нечаканыя падарункі сусьветнай салідарнасьці, а не дыктуем замежным краінам: зрабеце нам так ці так. Палякі цалкам прапанавалі сваю праграму: курсы мовы, знаёмства з краінай, дзённае навучаньне. Мы гэтыя ўмовы прынялі з удзячнасьцю. Мы ня можам навязваць свае патрабаваньні: зрабеце нам завочнае аддзяленьне. Ёсьць Украіна, ЭГУ — калі ласка, завочнае. 230 чалавек — гэта зусім ня многа, проста маленькая школка, Беларусь нічога не губляе, юнакі і там, у Эўропе, будуць працаваць на карысьць Радзіме, як гэта добра зразумеў П.Севярынец.

Калі ласка, не друкуйце плётак ці абстрактных разваг, так просім вас мы, бацькі.

Няхай той, хто разважае, правільна ці няправільна робіцца, прыйдзе ў Камітэт і скажа: 1) Чым я магу дапамагчы? 2) Дайце мне адрасы вязьняў і іх сем'яў, я напішу лісты, зраблю пасылкі.

Думка пра кантроль над Камітэтам зусім здаецца абразьлівай і блюзьнерскай. У Камітэт уваходзяць прадстаўнікі «Вясны», АГП, ЗБС, і іншых грамадзкіх арганізацыяў і бацькі. Усе рашэньні прымаліся калегіяльна, і адбор быў даволі строгі.

Кажучы пра кантроль, можна прыйсьці да таго, як было з Марынічам: быццам ён сам у сябе скраў кампутары. Гэта проста зьдзек.

Можа, вы пракантралюеце, колькі сваёй душы гэтыя жанчыны аддалі нашым дзецям, колькі перадач занесьлі ў вязьніцу, колькі свайго здароўя аддалі, марозячыся і сустракаючы ўначы з Акрэсьціна?

**Маці маладафронтаўцаў, Менск**

# Алесь Аркуш: Замежжа — наш саюзьнік і база

**Віталь Сіліцкі ў артыкуле «Што трэба памятаць кожнаму беларусу?» (№28) бачыць пэрспэктыву далейшага дэмакратычнага развою Беларусі ў дысыдэнцкім руху. Мае рацыю. Але толькі часткова. Дысыдэнцкі рух — гэта сыход у катакомбы і андэграўнд. Гэта — мінімізацыя кантактаў з асноўнай масай грамадзтва. Гэта — запавольваньне руху.**

Які можа быць іншы шлях? Выхад за межы Беларусі. Пашырэньне беларускага поля.

У сёньняшні век глябалізацыі насамрэч неістотна, дзе чалавек фізычна жыве ці ў самой Беларусі, ці па-за яе межамі: — галоўнае, каб ён знаходзіўся ў беларусім дыскурсе, удзельнічаў у беларускім жыцьці. Гэта дэманструе на сваім прыкладзе і сам

**Працяг на старонцы 6.**

# Два словы пра Мілінкевіча-малодшага

Лідэры дэмакратаў ня маюць права займацца працаўладкаваньнем уласных дзяцей. Піша **Аляксандар Фядута.**

Ня будзем абмяркоўваць паводзіны Вітаўта Мілінкевіча ў Польшчы. Кожны малады чалавек вядзе сябе на свабодзе ў адпаведнасьці са сваімі ўласнымі ўяўленьнямі, а зусім не зважаючы на палітычныя пляны бацькі. Аднак прысутнасьць там Вітаўта Мілінкевіча абмеркаваць варта.

Кандыдат у прэзыдэнты мяркуе: калі бацька Вітаўта Мілінкевіча падвяргаўся рэпрэсіям, сын на агульных падставах мае права скарыстацца магчымасьцямі праграмы, адкрытай з ініцыятывы бацькі.

Асьмелюся запярэчыць: ня мае права. Менавіта таму, што бацька быў ініцыятарам праграмы. І яшчэ таму, што быў кандыдатам у прэзыдэнты. Г.зн. — нефармальным лідэрам апазыцыі, ейным тварам.

На форуме сайту «НН» ужо адзначылі: што Віктар Лукашэнка, што Вітаўт Мілінкевіч — адзін чорт. Калі дэмакраты крытыкуюць прэзыдэнта краіны за «працаўладкаваньне сына», лідэры дэмакратаў ня маюць права займацца падобным працаўладкаваньнем уласных дзяцей. Бо да сябе трэба ставіцца настолькі ж жорстка, як і да сваіх апанэнтаў.

Ёсьць стары антычны афарызм: «Што дазволена Юпітэру, не дазволена быку». Афарызм бясспрэчны, у тым ліку ў люстраным варыянце: «Юпітэр ня мае права прыпадабняцца быку».

Іншымі словамі, дзеці лідэраў павінны быць больш абмежаваныя ў сваіх дзеяньнях, чым дзеці шараговых апазыцыянэраў. І ніякія апраўданьні нічога ня вырашаць. Таму што дзеці і ўнукі Ўладзімера Ганчарыка і Сямёна Домаша «магчымасьцямі» татаў у бытнасьць іх галоўнымі апазыцыянэрамі краіны не карысталіся.

Ніколі ў жыцьці дырэктар школы №1 Горадні Ўладзімер Іванавіч Баран не дазволіў бы свайму сыну скарыстацца магчымасьцямі «дырэктарскага сына». У гэтым выпадку Аляксандру загадалі б, і — я ўпэўнены — той бы прыслухаўся да волі бацькі.

Шкада, што маральны аўтарытэт Уладзімера Іванавіча не перарос у маральны аўтарытэт Аляксандра Ўладзімеравіча — прынамсі, для іх ўнука і сына.

*(З скаротамі Рэдакцыі)*

# Троечнік і ў Польшчы троечнік

Ганаровы старшыня Беларускага ПЭН-Цэнтру **Лявон Баршчэўскі** — аб Праграме дапамогі рэпрэсаваным беларускім студэнтам імя Кастуся Каліноўскага.

«Праграма ўзьнікла з імкненьня дапамагчы беларускім студэнтам пасьля сакавіцкіх падзеяў. Было падпісана пагадненьне між А.Мілінкевічам і тагачасным прэм'ерам Польшчы К.Марцінкевічам аб выдзяленьні грошай на навучаньне.

Беларускія ўлады пасьля такога разьвіцьця падзеяў прытармазілі свой імпэт, перасталі выганяць юнакоў і дзяўчат з унівэрсытэтаў. Такім чынам, мэта на гэтым этапе ўжо была дасягнутая.

Потым жа ўзьнікла нейкая няёмкасьць, што трэба запоўніць усе выдзеленыя польскім бокам вакансіі. Сталі ўключаць у гэтыя сьпісы ня толькі непасрэдна рэпрэсаваных людзей, але і тых, у каго былі рэпрэсаваныя сваякі і т.д.

Гэта было не зусім правільна. Ня ўсе, хто паехаў на вучобу ў Польшчу, аказаліся гатовы да цяжкасьцяў, якія чакалі там. Навучаньне за мяжай — рэч цяжкая, не для шараговага студэнта, яе ня кожны зможа пацягнуць.

Было няправільным, што вырашылі запоўніць усе месцы, прапанаваныя польскім бокам. Трэ было пакінуць толькі сапраўды выключаных, а таксама тых, хто добра вучыўся ў Беларусі. А хто тут вучыўся на «тройкі», не пачне добра вучыцца за мяжой. Каб жыць на сьвеце, зусім не абавязкова мець дыплём аб вышэйшай адукацыі».

**Запісаў Зьміцер Панкавец**

**Болей на тэму: Інтэрнэт-канфэрэнцыя кіраўніцы Камітэту дапамогі рэпрэсаваным Іны Кулей адбылася на сайце www.svaboda.org**

# Алесь Аркуш: Замежжа — наш саюзьнік і база

**Працг са старонкі 5.**

сп.Сіліцкі, бо ягоны інтэлектуальны ўплыў на беларускае мысьленьне не залежыць ад таго, дзе на гэты момант спадар фізычна знаходзіцца: ці ў ЗША, ці беспасярэдне ў Беларусі. Прынамсі, я не адчуваю пэрыядычных ад'ездаў сп.Віталя на амэрыканскі кантынэнт.

Што з гэтага вынікае? Вынікае, што ў нашай сытуацыі жорсткага ўціску ўсяго беларускага ў самой Беларусі, мусім выносіць беларускую справу за межы самой краіны. Туды, дзе ёсьць для яе спрыяльныя ўмовы, найлепш у суседнія краіны — у Польшчу, у Літву, Украіну. Ствараць там выдавецтвы, інфармацыйныя агенцыі, студэнцкія клюбы і г.д. Як гэта было ў 20—30-х гадох у Празе.

Таму абсалютна дарэмна крытыкаваць «каліноўцаў» за іх ад'езд у Варшаву. Важна іншае, каб яны засталіся ў Польшчы беларусамі і не згубіліся для Беларускай Справы, нават калі й ня вернуцца на радзіму. Гэты масавы дэсант — цікавы экспэрымэнт. Мае рацыю Севярынец: «каліноўцы» мусяць умацоўваць сваю беларускую міні-супольнасьць. Прыйдзе час, — і яны нам вельмі спатрэбяцца. Гэта будзе баяздольная, адукаваная, правераная супольным лёсам каманда. Ужо зразумела: ніякая барыкада нам не дапаможа. Нам дапаможа Беларускі Дух. Калі ён будзе вытраўлены, вынішчаны — не застанецца ніякай пэрспэктывы.

Бо і Польшча, і Літва, і Украіна — ніякае для нас не замежжа. Мы жылі сотні гадоў поруч, часам ў супольных дзяржавах. Нашыя лёсы зьнітаваныя тысячагодзьдзямі. Па нейкім часе ўсё адно мы будзем жыць у адной супольнай Эўропе.

Мацуйма Беларусь паўсюль, дзе ёсьць якая-кольвечы магчымасьць, дзе ёсьць спрыяньне. Гартуйма Беларускі Дух!

**Алесь Аркуш,**
*Беласток-Полацак*

# Чорны жнівень

У канцы лета пасыпаліся трагічныя здарэньні з удзелам беларусаў, вымушаных зарабляць за мяжой.

Тэракт на Чаркізаўскім рынку 21 жніўня ў Маскве адабраў жыцьцё 41-гадовай гандляркі з Гомелю Ірыны Багамолавай. У яе засталося двое дзяцей. Прадпрымальнікі Гомелю і Менску пачалі збор сродкаў для сям'і загінулай.

27 жніўня стаў сапраўды чорным днём для жыхароў Ганцавічаў: у аўтамабільнай катастрофе пад Барысавам загінулі шэсьць мужчынаў, што вярталіся з заробкаў з Расеі. Самаму старэйшаму было 45 год. На момант пахаваньня ў Ганцавічах прыпынілі працу мясцовыя прадпрыемствы. Жалобная калёна расьцягнулася амаль на кілямэтар. У Ганцавічах гэта ня першы выпадак, калі пошукі лепшай долі ў Расеі абарочваюцца трагедыяй. Па словах мясцовых, працаздольнае насельніцтва штурхае за мяжу адсутнасьць працы на радзіме.

У той жа дзень у Воранежы чатыры будаўнікі-гастарбайтэры зь Беларусі зваліліся з рыштаваньняў. Адзін зь іх упаў з восьмага паверху і на дадзены момант знаходзіцца ў цяжкім стане. Мужчына, які атрымаў лёгкія пашкоджаньні, ад шпіталізацыі адмовіўся.

Апошнімі сталі гастролі для 26-гадовага беларускага акрабата, які выправіўся па заробак у Ірляндыю. Выконваючы трук, ён упаў з-пад купалу цырку і быў прыдушаны канструкцыяй, што ўпала на яго. Яго жонка пры гэтым зламала руку. Беларусы падпрацоўвалі ў ірляндзкай цыркавой трупе «Royal Russian Circus», якая набірае на летнія гастролі артыстаў пераважна з Усходняй Эўропы.

Чаго ж не жывецца людцам у «стабільнай і квітнеючай», чаму разьвітваюцца з жыцьцём на чужыне, а ня ў роднай хаце? Адсутнасьць аплатнае працы на радзіме, панаваньне хамства і прымусу гоняць людзей у сьвет на заробкі.

**Сямён Печанко**

# Мілінкевіч: рэфэрэндум недапушчальны

Імаверны расейска-беларускі рэфэрэндум па «канстытуцыйным акце саюзнай дзяржавы» стаўся тэмай сустрэчы ў Менску лідэра аб'яднаных беларускіх дэмакратычных сіл Аляксандра Мілінкевіча з прадстаўнікамі дыпляматычнага корпусу эўрапейскіх краінаў, акрэдытаваных у Беларусі.

Лідэр Дэмакратычных сілаў зьвярнуўся праз дыпляматаў да ўрадаў Эўропы з просьбай «не чакаць даты прызначэньня рэфэрэндуму, а ўжо ў найбліжэйшы час выпрацаваць адзіную пазыцыю дзяржаў Эўропы па непрызнаньні вынікаў рэфэрэндуму».

Сваю пазыцыю Аляксандар Мілінкевіч патлумачыў тым, што ў сёньняшніх беларускіх умовах нельга разьлічваць нават на мінімальную аб'ектыўнасьць і празрыстасьць вынікаў рэфэрэндуму.

«Ва ўмовах татальнай манаполіі дзяржавы на інфармацыю большасьць беларусаў ня змогуць атрымаць усёй інфармацыі пра рэальныя пагрозы рэфэрэндуму і пра небясьпеку страты Беларусьсю незалежнасьці. (...) Сёньня таксама не йснуе рэальных мэханізмаў кантролю грамадзтва за падрыхтоўкай і працэсам галасаваньня, а таксама за падлікам галасоў. У гэтых умовах рэфэрэндум (...) можа прывесьці да зьнікненьня Беларусі з палітычнай мапы сьвету», — заявіў Аляксандар Мілінкевіч.

Аляксандар Мілінкевіч адзначыў, што эўрапейскія краіны павінны называць працэсы сваімі імёнамі — «Гэта ня будзе аб'яднаньне дзьвюх краінаў, гэта сапраўдны аншлюс, эканамічнае паглынаньне Беларусі».

«Лукашэнка загуляўся ў аб'яднаньне, ён загнаны ў кут і выбару ўжо ня мае. Сёньня яго нельга лічыць гарантам незалежнасьці Беларусі, гарантам сёньня зьяўляецца беларускі народ. І я ўжо сёньня заяўляю пра пратэсты ў выпадку прызначэньня і правядзеньня рэфэрэндуму», — сказаў лідэр дэмсілаў.

На сустрэчы былі дыпляматычныя прадстаўнікі Францыі, Нямеччыны, Вялікай Брытаніі, Швэцыі, Італіі, Летувы, Латвіі, Румыніі, Чэхіі, Польшчы, Нідэрляндаў, Славакіі.

**АК**

# Пазоў на 30 мільёнаў супраць газэты «Товарищ»

Пазоў аб абароне гонару і годнасьці падаў старшыня асацыяцыі «Сталічнае таксі» Ігар Верхавец.

Адказчыкі — газэта «Товарищ» (пазоў супраць яе складае 15 млн рублёў) і прафсаюзны актывіст, таксіст Павал Паддубскі (15 млн рублёў), які напісаў артыкул аб праблемах менскіх таксістаў. Рэч у тым, што з 1 студзеня 2007 г. таксісты ня змогуць працаваць на аўтамабілях, выпушчаных 10 год таму, ды страцяць працу.

Паддубскі выказаў здагадку, што сытуацыя на руку асацыяцыі «Сталічныя таксі», якую ўзначальвае сп.Верхавец. І.Верхавец таксама зьяўляецца гендырэктарам прадпрыемства СІА-АЎТА-007, у структуру якога ўваходзяць служба «Таксі-007», адзін з найбуйнейшых менскіх таксапаркаў, а таксама «Спас-007», што займаецца эвакуацыяй машын і дапамогай аўтамабілістам, што трапілі ў аварыю.

Старшыня асацыяцыі палічыў заяву зьнявагай і запатрабаваў 30 млн рублёў кампэнсацыі з газэты і аўтара матэрыялу. Галоўны рэдактар «Товарища» Сяргей Вазьняк спадзяецца, што пазоў ня будзе мець судовай пэрспэктывы. «У артыкуле Паддубскага выказвалася толькі меркаваньне, што ў колах таксоўшчыкаў лунае думка, што ўся гэтая сытуацыя на руку сп-ру Верхаўцу і скіраваная суапрць дробных таксаперавозчыкаў. Мы можам прывесьці ў суд іншых таксістаў, якія пацьвердзяць, што такія думкі ходзяць».

**АГ**

# Права на правапіс


PHOTO.BYMEDIA.NET
Ажыцьцяўляць правапісную рэформу даручана Аляксандру Радзькову.

25 жніўня Аляксандар Лукашэнка за зачыненымі дзьвярыма сустрэўся зь міністрам адукацыі Аляксандрам Радзьковым. Кіраўнік дзяржавы даручыў чыноўніку распрацаваць новыя правілы правапісу. Мяркуецца, што зьмены Лукашэнка зможа зацьвердзіць ужо праз два тыдні.

Як аказалася, праект рэдакцыі новага правапісу быў даўно гатовы. Пра гэта ў аўторак паведаміла газэта «Советская Белоруссия — Беларусь сегодня». Працоўную групу ў распрацоўцы зьменаў у правапіс узначальвалі доктар філялягічных навук Віктар Іўчанкаў і дырэктар Інстытуту мовазнаўства Аляксандар Лукашанец (гутарку з апошнім можна прачытаць на старонцы 35.).

Зьмены ў правапісе будуць мінімальныя. Усё зводзіцца да больш пашыранага ўжытку літары «ў» і спрашчэньня правілаў пераносу. Дык тады дзеля чаго такі аўрал?

У незалежнага грамадзтва існуе меркаваньне, што ўпарадкаваньне правапісу беларускай мовы патрэбнае дзеля таго, каб забараніць ужываньне клясычнага, незрусіфікаванага правапісу. Гэта перакрэсьліла б рашэньне Найвышэйшага гаспадарчага суду ад 1998 году, якое выкарыстаньне такога правапісу дазваляла.

Мы апыталі выдаўцоў: яны ня маюць намеру адмаўляцца ад тарашкевіцы, а, наадварот, зьбіраюцца ўсякім чынам змагацца за яе ўжываньне (гл. ніжэй).

На беларускамоўных інтэрнэт-форумах і блогах праблема правапісу адразу выйшла на першае месца паводле папулярнасьці.

Ня выключана, што змаганьне за права беларусаў на правапіс ізноў кансалідуе грамадзтва, як гэта ўжо некалі было з Курапатамі, Ліцэем і «Нашай Нівай».

**Зьміцер Панкавец**

## Чаму «ўпарадкаваньне правапісу» выклікае непакой?

Не адбывалася публічнага разгляду зьменаў у правапісе з удзелам шырокай навуковай грамадзкасьці. Нарэшце, і гэта скандальна, лёс беларускага правапісу ў чарговы раз маюць вырашыць людзі, якія ў паўсядзённым жыцьці беларускай мовай не карыстаюцца. Гэта адкрыта каляніяльная практыка. Захаваньне і навязваньне каляніяльных нормаў вяло і далей весьціме да дэпапулярызацыі беларускай мовы, пазбаўленьня яе калярыту.

Самі зьмены ў правапісе нязначныя і нічога не мяняюць у яго сутнасьці. Аднак выкарыстаньне «ўніфікацыі правапісу» як падставы для забароны або выцісканьня за мяжу краіны мэдыйных, культурных, літаратурных праектаў было б злачынствам, скіраваным на падрыў беларускае культуры.

## Выдаўцы гатовыя бараніць клясычны правапіс

Як будуць дзейнічаць выдаўцы, што карыстаюцца клясычным правапісам, калі ўлады пойдуць на яго забарону?

Рэдактар часопісу «ARCHE» Валер Булгакаў зьбіраецца «змагацца ўсімі магчымымі спосабамі: праз суд, пэтыцыі, нават акцыі грамадзянскага непадпарадкаваньня. Магчыма, пачнём выдавацца за мяжой, дзе ня будуць дзейнічаць такія патра-

# Аляксандар Лукашанец: «Ня ведаю, ці забароняць тарашкевіцу...»

«...Але асабіста я забараніў бы». Каб высьветліць усе пытаньні адносна ўдасканаленьня беларускага правапісу, «Наша Ніва» зьвярнуліся да дырэктара Інстытуту мовазнаўства імя Якуба Коласа Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі Аляксандра Лукашанца. «Слова «прэзыдэнт» будзе пісацца зь вялікай літары», — пацьвердзіў ён.

**«Наша Ніва»: Дык што нас чакае: рэформа правапісу ці нешта іншае?**

**Аляксандар Лукашанец:** Гэта не рэформа правапісу, а пэўныя ўдакладненьні ў існуючы ўжо правапіс, накіраваныя на зьмяншэньне колькасьці выключэньняў, на падпарадкаваньне агульным прынцыпам і фанэтычнага ладу, і жывога беларускага маўленьня. Гэтыя зьмены ня будуць закранаць асноўных прынцыпаў беларускага правапісу. Падрыхтаваны праект, на мой погляд, найбольш аптымальны ў моўнай сытуацыі, што існуе ў Беларусі, таму што ён дапаможа захаваць стабільнасьць беларускай пісьмовай мовы, забясьпечыць пераемнасьць у школьным навучаньні. Калі будзе захавана стабільнасьць нормаў, то гэта будзе спрыяць прэстыжу беларускай мовы, а гэта значыць і пашырэньню яе ўжываньня ў грамадзтве. Зьмяншаецца велізарная колькасьць выключэньняў.

**«НН»: Беларусь ужо пятнаццаць гадоў — незалежная дзяржава, зьмены ў правапісе адбываюцца толькі цяпер. Чаму?**

**АЛ:** Па-першае, зьмены ў правапісе непасрэдна не зьвязаныя з набыцьцём нашай краінай сувэрэнітэту. Зьмены ў правапісе абумоўлены разьвіцьцём самой мовы. Па-другое, любыя зьмены ў правапісе — справа складаная і далікатная, і носьбіты мовы адносяцца да гэтай праблемы па-рознаму. Нават у краінах, дзе функцыянуе толькі адна мова, да любых зьменаў ставяцца вельмі асьцярожна. Таму работа павінна быць вельмі карпатлівая, усё павінна быць дасканала выверана. Трэ было ўлічыць усе погляды пры працы над праектам. Я таксама лічу, што прайшло дастаткова шмат часу, але, можа, гэта і ня так дрэнна, бо эмацыйны падыход зьмяніўся цьвярозым навуковым, і гэта дазваляе больш аб'ектыўна вырашаць праблемы і прапанаваць аптымальныя варыянты. Толькі трэба як мага хутчэй паставіць у гэтай справе кропку і пачаць карыстацца агульнапрынятымі нормамі правапісу. Ніхто не абавязвае чалавека, як гаварыць, але абавязак дзяржавы запясьпечыць агульнае напісаньне. У іншым выпадку мы ня зможам захаваць адінства мовы, а для нас адзінства мовы — гэта абавязковая ўмова яе захаваньня.

**«НН»: Чаму падрыхтоўкай зьменаў займаецца Міністэрства адукацыі, а не Інстытут мовазнаўства?**

**АЛ:** Гэта не зусім дакладная інфармацыя. Дзяржкамісія ў 1993 годзе даручыла і Акадэміі навук, і Міністэрству адукацыі падрыхтаваць новую рэдакцыю зьменаў правапісу. Над гэтым варыянтам працавалі і нашыя спэцыялісты, і мовазнаўцы беларускіх унівэрсытэтаў, гэта значыць праект падрыхтаваны сумеснымі намаганьнямі.

**«НН»: Ці будуць зьмены ў правапісе вынесеныя на абмеркаваньне шырокай грамадзкасьці?**

**АЛ:** Іх ужо неаднаразова абмяркоўвалі. Дадатковыя абмеркаваньні могуць толькі пагоршыць варыянт, які ўжо існуе, абмяркоўваць можна бясконца. Мы дасылалі варыянты на абмеркаваньне ва ўсе ўстановы адукацыі.

**«НН»: Ці будзе які-небудзь падручнік з усімі зьменамі правапісу?**

**АЛ:** Будзе не падручнік. Будзе праца ў выглядзе новага зводу «Правілаў беларускай артаграфіі і пунктуацыі», падрыхтаванага рабочай групай пад кіраўніцтвам акадэміка Падлужнага. У складзе рабочай групы таксама працавалі: прафэсар Арнольд Міхневіч, Павал Шуба, Міхась Яўневіч, Аляксандар Крывіцкі. Гэта ўсё высокакваліфікаваныя спэцыялісты ў галіне айчыннага мовазнаўства, прычым з розных галінаў. Падлужны — фанэтыст, Крывіцкі — дыялектоляг, Яўневіч — сынтаксіст, Шуба — марфоляг, Міхневіч — граматыст. Былі ахопленыя ўсе пласты мовы.

**«НН»: Ці замінае існаваньне ў беларускай мовы двух правапісаў?**

**АЛ:** Лічу, што замінае. Патрэбная стабільнасьць правапісных нормаў мовы, разнабой перашкаджае працэсу

Працяг на старонцы 10.

баваньні. Калі такі закон урэшце прымуць, то гэта будзе амаральны закон». Разам з тым, Булгакаў падкрэсьлівае, што ягоны часопіс ніколі ня гідзіўся наркамаўкі, а наадварот, усе тэксты, што прыходзяць у рэдакцыю афіцыйным правапісам, гэткім жа і друкуюцца. Валер адзначыў, што пераход на наркамаўку «ARCHE» адбудзецца, толькі калі ня будзе іншай магчымасьці выходзіць.

Выдавец Ігар Логвінаў, які ўжо выпусьціў некалькі тузінаў мастацкіх кніг тарашкевіцай, кажа, што не зьбіраецца адхрышчвацца ад гэтага правапісу. Ён не разумее, як можна забараніць правапіс, на якім пішуць людзі і выходзяць кнігі. «Гэта немагчыма, бо напісана, што кнігі могуць выдавацца на ўсіх мовах сьвету, а якім правапісам — не настолькі істотна».

Каардынатарка «Бібліятэкі Бацькаўшчыны» Алена Макоўская мяркуе, што гэтае пытаньне варта разглядаць у меру ўзьнікненьня праблемы. «Пакуль мы нічога ня будзем мяняць у нашых выдавецкіх праектах. Вядома, што адмаўляцца ад тарашкевіцы ніхто не зьбіраецца, а як будзе — пасьля паглядзім».

Падобнае меркаваньне мае гісторык і рэдактар Алег Гардзіенка, які кажа, што пакуль ня варта гадаць на кававай гушчы. «Пачасту ў выдавецкіх праектах, у якіх я браў удзел, у эміграцыйных аўтараў адной з абавязковых умоваў друку было тое, каб іх працы выходзілі менавіта клясычным правапісам. Цяпер ня ведаю, як мы будзем працаваць з гэтымі людзьмі, бо эміграцыі не забароніш ужываць тарашкевіцу.

ЗП

# Аляксандар Лукашанец: «Ня ведаю, ці забароняць тарашкевіцу...»


АНДРЭЙ ЛЯНКЕВІЧ

Аляксандар Лукашанец: Галоўная навіна правапісу — «прэзыдэнт» будзе пісацца зь вялікай літары.

Працяг са старонкі 9.

навучаньня беларускай мове ў школе і выкарыстаньню яе ў розных сфэрах камунікацыі. Толькі строгае адзінства правапісных нормаў можа забясьпечыць беларускай мове выкарыстаньне ў тых ці іншых сфэрах жыцьця. Пісьмовая мова павінна быць адзінай і аднастайнай.

**«НН»: А як Вы адносіцеся да сынтэзу двух правапісаў, які выкарыстоўвае на сваіх старонках часопіс «Дзеяслоў»?**

**АЛ:** Гэта вельмі дрэнны варыянт, бо не прытрымліваецца ніводзін падыход, цалкам парушаная сыстэматычнасьць. Гэта яшчэ горш, чым два крайнія варыянты. Ведаеце, вучань павінен верыць таму, што надрукавана. У нас жа ў адным выданьні напісана так, у іншым — гэтак, то каму ён павінен верыць?

**«НН»: Дарэчы, як правільна пісаць наркамаўкай: «лідэр», як напісана ў падручніках, ці «лідар», як піша «Звязда»?**

**АЛ:** Не ўжывайце, калі ласка, гэтага слова, «наркамаўка», я не прымаю яго, як і «тарашкевіца», бо абодва словы няправільна адлюстроўваюць сутнасьць гэтых правапісных сыстэмаў. На сёньняшні дзень правільна пісаць «лідэр», але прапануем у гэтым варыянце правапісу пісаць «лідар». У гэтым і праяўляецца разнабой, які мы мусім ліквідаваць. Таксама пашыраецца ўжываньне літары «ў» у словах іншамоўнага паходжаньня. Ва ўласных імёнах вялікая літара «Ў» ужывацца ня будзе. Будуць вельмі спрошчаны правілы пераносу. Слова «прэзыдэнт» будзе пісацца зь вялікай літары.

**«НН»: А што рабіць, што пісаць у такіх выпадках школьніку, які піша цэнтралізаванае тэставаньне на роднай мове?**

**АЛ:** Я ўпэўнены, што заданьняў кшталту «лідэр» ці «лідар» на іспытах бліжэйшыя гады ня будзе, бо патрэбен час, каб звыкнуцца з новым напісаньнем.

**«НН»: Дык ці змогуць выходзіць газэты, часопісы ці кнігі клясычным правапісам?**

**АЛ:** Я не магу гэтага знаць. Калі б гэта залежала ад мяне, то я б забараніў ужываньне паралельнага правапісу ў афіцыйным ужываньні і беларускіх вы-

даньнях, разьлічаных на масавага чытача. Ніхто ня зможа забараніць другі правапіс, напрыклад, у прыватнай перапісцы. Аднак што будзе, я ня ведаю.

**«НН»: Аляксандар Аляксандравіч, кажуць, цяпер па-беларуску трэба будзе абавязкова пісаць імя Мікалай, а не Мікола, гэтаксама і з астатнімі беларускімі імёнамі.**

**АЛ:** Гэта ня так. Ніхто вам не забараняе быць запісаным у пашпарце Алесем, але і па-расейску тады вашае імя будзе гучаць, як Алесь. Адпаведна і дзеці будуць Алесевічы, а не Аляксандравічы. Калі вас такое задавальняе, то ніхто не забараняе ўжываць такія формы імёнаў.

**Гутарыў ЗП**

# Прынцыпы «лукаш*а/э*нкаўкі»

Якія зьмены ў правапісе плянуюцца?

Пры канцы 2002 г. Інстытут мовазнаўства імя Якуба Коласа НАРБ ужо быў падрыхтаваў праект зьменаў у беларускім правапісе, але тады ён так і ня быў зацьверджаны А.Лукашэнкам. Якія зьмены прапаноўваў той праект?

Самай адыёзнай зьменай выглядала абавязковае напісаньне слова «прэзыдэнт» зь вялікай літары. Гэта выклікала мноства абураных водгукаў з боку незалежнага грамадзтва.

Таксама меркавалася пашырыць выкарыстаньне «аканьня» і «яканьня» як у беларускіх, гэтак і ў запазычаных словах. Напрыклад, «с*я*мнаццаць», «камп'ют*а*р», «лід*а*р». Мусілі амаль цалкам зьнікнуць спалучэньні «іо/ыо», замест якіх ва ўжытку пашыраліся «іё/ыё» (цяпер ад гэтай ідэі адмовіліся, хіба дзеля таго, што гэта павялічвала адрозьненьне беларускай мовы ад расейскай).

Адным з пунктаў таго праекту было зьнікненьне правілаў пераносу, бо іх, на думку мовазнаўцаў, працягваюць трымацца толькі школьнікі ды аўтары падручнікаў.

Меласяпашырыцца ўжываньне літары «ў» у такіх выпадках, як, напрыклад, «ва *ў*ніверсітэце». Але цалкам адмаўлялася выкарыстаньне вялікай літары «Ў».

Думалася крыху пашырыць напісаньне літары «э» ў словах іншамоўнага паходжаньня: «сэкс».

Той праект абсалютна не прымаў ужытак мяккага знаку, які стаўся галоўным пунктам адрозьненьня паміж двума правапісамі. Распрацаваны ён быў нядаўна памерлым экс-дырэктарам Інстытуту мовазнаўства Аляксандрам Падлужным.

Той варыянт зьменаў правапісу ня трапіў на разгляд грамадзкасьці. Падлужны меркаваў, што немэтазгодна праект абмяркоўваць з усімі, дастаткова толькі меркаваньняў «спэцыялістаў». Відавочна, што падобнае можа адбываецца і цяпер.

Незалежныя выданьні, якія друкуюцца тарашкевіцай, тады былі надзвычай заклапочаныя, што іх прымусяць выходзіць афіцыйнай нормай правапісу. Гэтага ня здарылася ў 2003 г. Што ж будзе праз тры з паловай гады?

**ЗП**

## АПЫТАНЬНЕ НА САЙЦЕ «НН»

**Якім правапісам вы карыстаецеся?**

| | |
|---|---|
| Афіцыйным правапісам | 19 (17.8%) |
| Клясычным правапісам | 54 (52.2%) |
| Лацінкай | 5 (5.6%) |
| То так, то гэтак — пад настрой | 24 (24.4%) |

Усяго прагаласавала ад панядзелка да серады: **102**

# Артаграфія вершаў Быкава

**Як толькі навіна пра падрыхтоўку зьменаў у правапіс зьявілася ў пятніцу, на яе адразу бурна адгукнуліся чытачы сайту «Нашай Нівы» nn.by. Як інтэрпрэтуюць гэты крок уладаў і як зьбіраюцца рэагаваць на яго інтэрнаўты? Вось частка водгукаў.**

**Кірыл Яраш Жнівень 25, 2006 у 16:51**
Ну, браточкі, будзе ў нас цяпер тры артаграфіі...

**Віталь В. Жнівень 25, 2006 у 19:14**
Гэта будзе такая асаблівая арфаграфія для запісваньня вершаў Быкава, прозы Барадуліна і нашых з вамі драмаў...

**babaj Жнівень 26, 2006 у 23:25**
tavaryshch stalin, vy balshoj uchonyj v jazykaznanji znajecie vy tolk!!!

**Яўген Жнівень 25, 2006 у 23:25**
Пацаны, гэта яны клясычны правапіс хочуць забараніць!.. І гэта магчыма. Раней нават праз суд не атрымоўвалася. А цяпер можа надысьці гамон.

**Marya Жнівень 25, 2006 у 23:28**
Learning «narkamauka» in the university in Germany, reading taras^kevica in NN — but lukas^eiva: never!

**Толік Жнівень 25, 2006 у 23:42**
А я, бадай, прасіў бы «НН» лепей перайсьці на наркамаўку, толькі не закрывацца.

**Геня Жнівень 26, 2006 у 7:34**
Вялікі Дзядзька з такою цяжкасьцю чытаў карнавальную клятву па-беларуску, што, пэўна ж, тады і вырашыў: трэба падпрасьціць гэты перажытак нацдэмаўшчыны.

**Барбар Жнівень 26, 2006 у 19:52**
А мо' ён хоча «Звязду» на клясычны правапіс перавесьці ды на БТ гэтаксама ўсё па-беларуску аднавіць, а вы так аб чалавеку блага падумалі.

**Спадар Беларусь Жнівень 28, 2006 у 9:46**
«Наша Ніва» мусіць выдавацца ТОЛЬКІ тарашкевіцай і не зважаць на спробы розных манкрутаў і рэнэгатаў зьнішчыць нашу крывіцкую гаворку. Ніякія зьмены мовы лукашыстамі ня могуць быць законнымі і прыняты Беларускім народам.

**Алесь Жнівень 28, 2006 у 17:03**
І аднаго ня ўцямяць гора-карэкціроўшчыкі беларускай мовы, што гэта мова для нас Сьвятая. Хай бы яны расейскія мацюкі ўнармавалі і карысталіся ў размовах між сабой. А на Сьвятое хай не разяваюць свае зяпы!!!

**Падрыхтаваў Зьміцер Панкавец**

# Няма мовы

Заўтра ў нас пачнуць адбіраць імёны. Пра «рэформу правапісу» піша Віталь Тарас.

За апошнія 15 гадоў сфэра ўжытку беларускай мовы, на вялікі жаль, скарацілася — у прыватнасьці, у мэдыях. І адказнасьць за гэта нясуць ня толькі ўлады, але й грамадзтва. У тым ліку, журналісты недзяржаўных СМІ.

Гэтую даволі нескладаную тэзу некаторыя з калегаў успрынялі па-свойму. Давялося чуць меркаваньне, быццам я заклікаю ўсіх бегчы ў беларускія выданьні, а расейскамоўныя газэты — закрыць. Бегчы, ясная справа, нікуды ня трэба. Усім варта заставацца на сваіх месцах і займацца сваёй справай.

Апошнія падзеі — паведамленьне аб «рэформе» беларускай мовы — вымушаюць вярнуцца да гэтай тэмы.

Мы пакуль ня ведаем зьместу «рэформы». Як заўсёды, усё вырашаецца (ці ўжо вырашана) за нашымі сьпінамі, у чыноўніцкіх кабінэтах. Нават акадэмікам, сярод якіх большасьць служыць цяперашняй уладзе і гатовая падтрымаць любую ініцыятыву зьверху, улада не давярае. Рэформа даручаная Міністэрству адукацыі. Пры гэтым ключавую ролю тут адыгрывае ня слова «адукацыя», але слова «міністэрства». Можна не сумнявацца, яно хутка і бязь лішняга шуму выканае даручэньне кіраўніка дзяржавы. Тым больш, што перад гэтым міністэрства ўжо дазволіла выкладаць у школах гісторыю Беларусі па-расейску, спаслаўшыся на пажаданьні бацькоў.

Зразумела, што мову сама сабою ніякая рэформа ня зьменіць, як не зьмяніла яе наркамаўка. Нікуды не падзеліся ў вымаўленьні мяккія знакі альбо «дз» і «дж», «ў». Нават калі забараніць іх у адміністрацыйным парадку ці пачаць штрафаваць за «дзеканьне», пераважная большасьць беларусаў ня змогуць гаварыць інакш, як размаўлялі іхныя дзяды. І ніхто не забароніць у прыватным ліставаньні карыстацца клясычным правапісам.

З другога боку, калі б нават загадам у школах увялі тарашкевіцу, гэта не прывяло б, зразумела, да імгненнага росту нацыянальнай сьвядомасьці, росквіту беларускай культуры й літаратуры. А ўжо як абураліся б бацькі — пэўна, ня менш за прыхільнікаў расейскай мовы ў Латвіі…

Але справа ня ў гэтым. Адміністрацыйная рэформа мовы, ды яшчэ праведзеная такім шляхам — гэта чарговы плявок у твар беларускай інтэлігенцыі: настаўнікам, выкладчыкам, навукоўцам, пісьменьнікам, журналістам. І чарговым разам, можна не сумнявацца, інтэлігенцыя ўтрэцца. Ніякіх пратэстаў з боку настаўнікаў, а тым больш школьнікаў і студэнтаў ня будзе. Будуць пратэсты з боку БНФ, некаторых іншых палітычных партый, на якія ўлады не зьвяртаюць аніякай увагі. Магчыма, будуць асобныя пратэсты з боку некаторых пісьменьнікаў (пазбаўленых Дому літаратара) і беларускіх журналістаў.

Журналістам расейскамоўных выданьняў, пэўна, стане прасьцей. Яны змогуць браць прыклад са сваіх калегаў з салідных расейскіх выданьняў, якія ўжо цяпер пішуць не Васіль Быкаў, а Василий Быков, не Беларусь, а — Белоруссия. Ужо цяпер на расейскамоўных беларускіх сайтах паведамленьні на тэму «рэформы» падыходзяць пад рубрыку «рознае», дзе яны могуць стаяць побач з паведамленьнем, напрыклад, аб тым, што расейская сьпявачака Жасьмін разьвялася з мужам. Лёс Жасьмін беларускага абывателя, напэўна, хвалюе больш, чым лёс беларускай мовы. Ён на гэтых «жасьмінах» узгадаваны.

Пытаньне ў тым, наколькі лёс мовы цікавіць журналістаў. Заўтра ў нас пачнуць адбіраць імёны: нельга будзе афіцыйна падпісвацца Алесем, Кастусём, Янкам, Янінай, Аленай, Ганнай, а толькі Аляксандрам, Канстанцінам, Іванам і г.д. Неймаверна? Але калі дзяржава лічыць сябе ў праве манапалізаваць словы «беларускі» і «нацыянальны», чаму яна ня можа распараджацца нашымі імёнамі? Кажуць, імя — гэта частка душы чалавека. Ці гатовыя мы на зьдзелку з д'яблам? Ці яна ўжо адбылася?




АНДРУСЬ ШПАКАЎ

# «Наша Ніва — Советская Белоруссия»



Гумарэска Лёліка Ушкіна.

**З рапарту апэратыўнага агента 0375 (ліцэнзія на арышт за лаянку) у Камітэт Дэ Бэ:**

25 жніўня, выконваючы заданьне, інтэгрыраваўся ў натоўп на Бангалоры. Каб увайсьці ў кантакт з дэструктыўнымі элемэнтамі, у адпаведнасьці з інструкцыямі, гучна енчыў: «Падымі мяне па-над зямлёю» і «Пятроўна, падай вады!». У выніку пазнаёміўся з падазронымі асобамі, якія нешта казалі пра сотую гадавіну нейкай «Нашай Нівы». Паколькі інструкцыяў арыштоўваць апазыцыянэраў за калекцыянаваньне старых аўтамабільных марак, прынамсі «Нівы», не было, нікога не павінціў. Прашу на будучыню інфармаваць, ці падпадае гэтая практыка пад артыкулы Адміністрацыйнага кодэксу.

**Агент 0375**

**З паведамленьня кіраўніцтва Камітэту Дэ Бэ ў адміністрацыю кіраваньня прэзыдэнтам:**

Інфармуем, што нацыяналістычнымі коламі плянуеца шырокае сьвяткаваньне стогадовага юбілею газэты «Наша Ніва», якое будзе мець шырокі рэзананс у грамадзтве. Прапануем прэвэнтыўна арыштаваць калектыў рэдакцыі на той падставе, што ў рамках сьвяткаваньня адмарозкі плянуюць распаўсюдзіць наклад газэты, старонкі якога будуць прамочаныя ядам курарэ (трохлітровы слоік з атрутай падкінем на рэдакцыйную кухню). Акрамя таго, у дзень юбілею журналісты плянуюць захапіць вакзал, пошту і тэлеграф, а таксама узарваць дзьве школы з расейскамоўным навучаньнем.

**Старшыня Камітэту Дэ Бэ**

**Выпіс з пратаколу паседжаньня ідэалягічнага дэпартамэнту адміністрацыі:**

Слухалі тэму «Стагодзьдзе «Нашай Нівы». Тав.А інфармаваў аб тым, якую пагрозу нясе правакацыя нашаніўцаў. Тав.Б прапанаваў забараніць «Нашу Ніву» і адначасова зарэгістраваць паралельнае выданьне з той самай назвай. Такім чынам, усе ляўры гісторыі «НН» перападуць дзяржаве.

Тав.В, спасылаючыся на брак часу, прапанаваў пусьціць вутку, што законным нашчадкам «НН» ёсьць адно зь існых цяпер афіцыйных выданьняў. Ён аргумэнтваў прапанову наступнымі словамі: «Калі мы ўсе тут згодныя з тым, што Скарына жыў у Піцеры, то давесьці тое, што «Фізкультурнік Беларусі» пачаў выдавацца ў 1906 г., будзе раз плюнуць. Сход падтрымаў прапанову тав.С.

Кіраўніку дзяржавы прапанаваны сьпіс выданьняў, якія могуць выканаць функцыю «сапраўднага нашчадка «НН». Сьпіс газэтаў дадаецца: «Переходный возраст», «Союз» — дадатак да «СБ», «Планета», «Трактарабудаўнік».

**З рэзалюцыі кіраўніка:**

Загадваю шырока адсьвяткаваць стагодзьдзе «НН», якая сёньня выходзіць пад назвай дадатак да «Саўбелкі» «Союз». Прызначыць навуковую камісію з старшынём — акадэмікам К.

**Зь дзёньніка Аліны К.:**

Дарагі дзёньнік, сёньня тата прыйшоў дахаты нейкі дзіўны. Увесь вечар піў і крычэў, што яны там на Маркса канчаткова зьехалі з глузду. І што калі так пойдзе далей, то яго прымусяць пісаць паэму Быкава. Потым пазваў мяне, каб я напісала пад дыктоўку дзіўны тэкст.

**Зь перадавіцы газэты «Советская Белоруссия»:**

Незвычайнае адкрыцьцё зроблена маладымі архівістамі ў доме, дзе, як высьветлілася, калісьці спыняўся адзін з заснавальнікаў «Нашай Нівы» Антон Луцкевіч. Як сьведчыць ліст, нечакана знойдзены ў антрысолях, насамрэч сапраўдная назва славутай «Нашай Нівы» — «Союз» — дататак да «Беларусь Сегодня».

У сваім лісьце да Вацлава Ластоўскага Луцкевіч піша: «Дарагі сябра, як ты ведаеш, мы актыўна працуем над першай беларускай газэтай. На сходзе рэдакцыі ўсе адзінадушна падтрымалі ідэю, што газэта мусіць насіць назву «Союз» — дадатак да газэты «Советская Белоруссия», а сябе, то бок выдаўцоў, называць Саветам міністраў Саюзнай дзяржавы. Аднак у апошні момант дзеля канспірацыі вырашылі часова называцца «Наша Ніва».

**Разнарадка менскім адзелам БРСМ:**

Усім раённым кіраўнікам забясьпечыць яўку як мінімум па 5 асобаў ад клясы ці групы на сьвяткаваньне стагодзьдзя «Нашай Нівы». Збор — Кастрычніцкая плошча. Агітпрадукцыя — транспаранты з тэкстам «Слава братам Луцкевічам», «Союзу» жыць у вяках!» — выдаць пад расьпіску. Тых, хто прасачкуе, абавязаць падпісацца на два камплекты газэты «Наша Ніва — Советская Белоруссия».

**Старшыня менскай арганізацыі БРСМ**




## Рэвалюцыя — гэта рэйв

У Менску зьявіўся мультымэдыйны дыск «Open air revolution». Яго ананімныя аўтары разглядаюць падзеі Сакавіка-2006 з пункту гледжаньня поп-культуры — як першы беларускі рэйв на сьвежым паветры. Але можна і не заглыбляцца ў культуралёгію: відэа- і фатахроніка дапаможа жыва згадаць сакавіцкія падзеі. Галасы Плошчы, хроніка Плошчы, героі і ворагі Плошчы — усё гэта на адным дыску. Распаўсюджваецца дыск бясплатна. Даведкі — на сайце www.za-svabodu.org.


ЮЛІЯ ДАРАШКЕВІЧ

Вітаўт Мілінкевіч Сакавік-2006 правёў у Менску.

## Мілінкевіч: З майго сына павінны патрабаваць, як зь любых іншых

У прэс-службе Аляксандра Мілінкевіча абверглі інфармацыю пра тое, што сын лідэра дэмакратычных сілаў Вітаўт у п’яным выглядзе дэбашырыў у Польшчы.

Інфармацыя пра тое зьявілася на сайце «Беларуская салідарнасьць», які курыруецца лідэрам КХП БНФ Зянонам Пазьняком, і была падхопленая БТ.

«Інфармацыя, агучаная БТ і сайтам «Беларуская салідарнасьць», — хлусьня», — заявіў прэс-сакратар А.Мілінкевіча Павал Мажэйка.

Як зазначыў П.Мажэйка, адной з умоваў моўных курсаў, на якіх навучаюцца ўдзельнікі праграмы Каліноўскага, ёсьць абавязковае наведваньне ўсіх экскурсій і імпрэзаў. Адну з такіх экскурсій Вітаўт Мілінкевіч праспаў.

Перад арганізатарамі праграмы, зьвяртае ўвагу прэс-сакратар, паўстала праблема: ці варта ўжываць жорсткія захады ў дачыненьні да сына непасрэднага ініцыятара навучальнай праграмы фонду.

А.Мілінкевіч заявіў кіраўнікам праекту наступнае: «Усе ўдзельнікі праграмы мусяць быць у роўных умовах. Так павінна быць, не зважаючы, хто чый сваяк».

Як вынік, Вітаўта Мілінкевіча пазбавілі пражываньня ў інтэрнаце, аднак ён працягвае самастойна рыхтавацца да іспытаў у адзін з польскіх унівэрсытэтаў.

**АГ**

## Івашкевіч: Кандыдаты на мясцовых выбарах хай стануць дэлегатамі новага Кангрэсу

На сойме Партыі БНФ 26 жніўня Віктар Івашкевіч прапанаваў схему пераадоленьня кааліцыйнага крызісу ў дэмакратычных сілах з выкарыстаньнем мясцовых выбараў.

Сутнасьць прапановы: усе партыі вылучаюць кандыдатаў на мясцовыя выбары шляхам збору подпісаў. Тыя кандыдаты, якія зьбяруць 500 і болей подпісаў, незалежна ад рэгістрацыі ці нерэгістрацыі на выбарах і вынікаў саміх выбараў, аўтаматычна становяцца дэлегатамі Кангрэсу дэмсілаў, які прымае далейшыя рашэньні.

Падчас абмеркаваньня прапановы Віктара Івашкевіча на сойме галасы падзяліліся.

**МБ**

## Пачатак новага палітычнага сэзону

Новы палітычны сэзон аб’яднаная апазыцыя распачала ня вулічнымі акцыямі пратэсту, а фотавыставай «За Свабоду й Незалежнасьць», што адкрыла сваю экспазыцыю 24 жніўня ва ўправе Партыі БНФ (былая Варвашэні, 8).

Арганізатары выставы сабралі ў адной залі працы


АНДРЭЙ ЛЯНКЕВІЧ

шматлікіх фатографаў, сярод іх і фотакарэспандэнткі «Нашай Нівы» Юліі Дарашкевіч, якія адлюстроўваюць падзеі вясны-2006 з Плошчай, намётавым мястэчкам, акцыямі пратэсту, арыштамі і судамі.

Заля не магла зьмясьціць усіх ахвотных **(на фота)**, і многім даводзілася стаяць у чарзе на вуліцы.

Экспазыцыя сапраўды маштабная. Яна будзе працаваць тры тыдні.

**ЗП**

## Для беларусаў выпусьцяць куцаватую Windows?

У 2007 годзе ў Беларусі будзе распачатая глябальная праграма ў барацьбе зь пірацкім праграмным забесьпячэньнем. Апроч акцызных марак, якія будуць вылучацца пад легальныя партыі дыскаў, урад пляное завабіць пад сьцягі змаганьня зь піратамі вытворцаў праграмаў.

Каб пераход ад таннай неліцэнзійнай прадукцыі да легальных копіяў не спустошыў кішэні, у Беларусь будуць пастаўляць «аблегчаныя» копіі па цане значна ніжэйшай ад рынкавай. На гэты момант вядуцца перамовы з Microsoft'ам што да выпуску для беларускага рынку Windows XP Light.

У новым варыянце апэрацыйнай сыстэмы будуць толькі самыя неабходныя функцыі. На думку экспэртаў, што ўваходзяць у склад адмысловай камісіі, шараговыя беларусы рэдка карыстаюцца ўсімі магчымасьцямі прафэсійных вэрсій.

На сёньня кошт паўнацэннай Windows XP Professional у Менску 160 даляраў. Home edition прадаўцы гатовыя аддаць удвая таньней. Зрэшты, і гэта не па кішэні многім беларусам. Калі перамовы з Microsoft'ам пройдуць удала, апэрацыйная сыстэма Light у Беларусі будзе прадавацца за 20—30 даляраў. Тое самае тычыцца й ліцэнзійных гульняў. Праўда, з апошнімі сытуацыя даволі далікатная.

Расейскія дыстрыбутары і так прапануюць дыскі па выкідной (у параўнаньні з Эўропай) цане. Цяпер кошт адной гульнявой праграмы не перавышае 8 даляраў. Для Беларусі гэтая цана мусіць быць сама меней удвая меншай, лічаць ініцыятары антыпірацкай праграмы. Ня выключана, што на кардынальнае зьніжэньне цаны расейцы ня пойдуць, бо сабекошт выпуску адной копіі праграмы большы за 3—4 даляры. Да таго ж, Расея не разглядае беларускі рынак ПЗ у якасьці стратэгічнага.

**Паводле BelSwissBank**



Плютон (зьлева) меншы нават за Месяц (у цэнтры).

## Плютон болей не плянэта

**Плютон быў адкрыты ў 1930 годзе амэрыканцам Клайдам Томба. Яго прызналі плянэтай, але ён адразу стаў выклікаць сумневы. Па-першае, малюпасенькі (меншы за Месяц). Калі ўсе прыстойныя плянэты ад Мэркур'я да Нэптуна кружаць у той самай плашчыні, арбіта Плютона нахіленая да яе на 18 градусаў, а да таго ж яшчэ яйкападобная. А тут яшчэ летась адкрылі далёка за Плютонам, за 16 млрд км ад Зямлі, плянэтоід 2003 UB313, большы дыямэтрам, чым Плютон. Міжнародны астранамічны хаўрус вырашыў упарадкаваць увесь гэты балаган. Астраномы аказаліся наўзьдзіў дружнымі ў сваёй выснове: Плютон — гэта не плянэта ў поўным сэнсе, як Зямля, Нэптун і іншыя, а ўсяго толькі карлікавая плянэта, як і іншыя целы, што абарачаюцца вакол Сонца.**

**МБ**



Такі ордэн будзе насіць Ніл Гілевіч.

## Гілевіч, Законьнікаў, Пашкевіч атрымалі ўзнагароды Украіны

Да 15-годзьдзя незалежнасьці прэзыдэнт Украіны Віктар Юшчанка падпісаў указ аб узнагароджаньні шэрагу замежных грамадзянаў, сярод якіх беларускія пісьменьнікі.

Ніл Гілевіч адзначаны ўкраінскім ордэнам князя Яраслава Мудрага 2-й ступені. Такой жа ўзнагародай уганараваныя разам зь ім генэральны сакратар Рады Эўразьвязу Хаўер Саляна, былы прэзыдэнт Чэхіі Вацлаў Гавал і экс-міністар замежных справаў Літвы Антанас Валеніс. Н.Гілевіч заявіў: «Гэтая ўзнагарода дапаможа мне пратрымацца і папрацаваць на літаратуру беларускую і на ўкраінскую».

Інакш паставіліся да народнага паэта, які неўзабаве адзначыць 75-годзьдзе, беларускія ўлады. Выдавецтва «Мастацкая літаратура» выкінула з выдавецкіх плянаў кнігу ягонай лірыкі «Выбранае».

Сяргей Законьнікаў і Алесь

Працяг на старонцы 16.

Працяг са старонкі 15?

Пашкевіч атрымалі ўкраінскія ордэны «За заслугі».

**Паводле радыё «Свабода»**



ІГАР МАРАЧКІН

**Сустрэчу сяброў СБП арганізавала Ада Райчонак.**

## Сустрэліся сябры Саюзу беларускіх патрыётаў

Сустрэча сяброў Саюзу беларускіх патрыётаў — падпольнай арганізацыі, што існавала ў 1945—1947 гадах, ставячы на мэце дасягненьне незалежнасьці Беларусі, прайшла ў Германавічах, што ў Шаркаўшчынскім раёне. Паслухаць вэтэранаў патрыятычнага падпольля прыехалі таксама палітвязьні іншага пакаленьня — удзельнікі сакавіцкага намётавага мястэчка ў Менску.

**Эўрапейскае радыё для Беларусі**

## Эгіпцяне падкапаліся пад дзьве мяжы — і ўсе беларускія

Два 20-гадовыя эгіпцяніны чакаюць у Расеі суду за спробу незаконнага пераходу мяжы з Украінай. Падчас сваіх памежных прыгодаў ім удалося пракапаць тунэль пад беларуска-польскай мяжой ражком для абутку і перабрацца ў Эўропу — праўда, ненадоўга.

Яны прыехалі ў Маскву па турыстычных візах. У расейскай сталіцы яны селі на цягнік да Менску, а адтуль аўтаспынам дабраліся да польскай мяжы, падкраліся да драцяных загародаў і пачалі капаць.

На польскай тэрыторыі нелегальныя імігранты зьбіліся з дарогі ды зноў наткнуліся на калючы дрот. Эгіпцяне падумалі, што гэта ўжо нямецкая мяжа, і з дапамогаю апрабаванага ў справе ражка, апынуліся на тым баку.

Аднак гэта была зусім не Нямеччына, а ўсё тая ж Беларусь, якую яны ня гэтак даўно пакінулі. Іх адразу ж затрымалі беларускія памежнікі. Абодва парушальнікі мяжы атрымалі 10 сутак арышту. Але і гэта не спыніла эгіпцянаў у іхным імкненьні ў Эўропу.



**Аж ня верыцца, што гэты лаз пракапаны ражком для абутку.**

Пасьля вызваленьня іх пасадзілі на цягнік да Масквы, аднак эгіпцяне сышлі задоўга да расейскай сталіцы і вырашылі паспрабаваць іншы маршрут — праз украінскую мяжу. Але фартуна ім зноў здрадзіла: расейскія памежнікі затрымалі эгіпцянаў ізноў.

**Паводле Бі-Бі-Сі**



ЮЛІЯ ДАРАШКЕВІЧ

## 15 тысяч турыстаў штомесяц у Міры

15 000 чалавек штомесяц наведваюць Мірскі замак летам гэтага году. На дзьве тысячы болей, як летась. Зьбольшага прыяжджаюць беларусы, расейцы і палякі.

15 тысяч — ці шмат гэта? Прыблізна ў 200 км ад Міра на літоўскай тэрыторыі знаходзіцца мястэчка Трокі, галоўная славутасьць якога, як і Міра, — княскі замак. Штогод яго наведваюць каля 350 000 турыстаў.

У Міры налета плянуюць адкрыць рэстарацыю ў замку і дабудаваць гасьцініцу.

**Паводле БЕЛТА, neris.mii.lt**

## Выйшаў новы «Дзеяслоў»

Выйшаў з друку «Дзеяслоў» №4, 2006. У нумары: паэзія Генадзя Бураўкіна, які сьвяткуе 70-годзьдзе, Сяргея Законьнікава, астравецкай журналісткі Ганны Чакур, кіраўніка Інфармацыйнай кампаніі БелаПАН Алеся Ліпая.

Друкуюцца пачатак аповесьці Вольгі Іпатавай «Апошнія ахвяры сьвяшчэннага дуба» пра Трох Віленскіх Пакутнікаў, тры кароткія «Практыкаваньні» Сяргея Дубаўца, «Голем з Малой Мар'ямпольскай» Зьмітра Дзядзенкі.

У разьдзеле «Архівы. Эсэ. Мэмуары. Дзёньнікі» — працяг успамінаў Ніла Гілевіча.




У разьдзеле «гісторыя» ўвагу заслугоўвае нарыс Алега Латышонка зь Беластоку «Штурм Рэчыцы войскамі генэрала Станіслава Булак-Балаховіча ў лістападзе 1920 г.».

**АГ**

## Генадзю Бураўкіну — 70

28 жніўня споўнілася 70 гадоў паэту Генадзю Бураўкіну. Ён нарадзіўся ў Расонскім раёне Віцебшчыны, на самай поўначы Беларусі. У 1980-х сп.Генадзь кіраваў тэлерадыёкамітэтам. У 1990-м стаў афіцыйным прадстаўніком Беларусі пры ААН. «Наша Ніва» далучаецца да віншаваньняў і зычыць моцнага здароўя.

**Мы здалёку ўбачылі свабоду І яшчэ ня вырваліся з пут...**



ЮЛІЯ ДАРАШКЕВІЧ

# Пісьменьнікі здалі Дом літаратара бяз бою

Саюз пісьменьнікаў усё ж выселілі з Дому літаратара. Адбылося гэта ў сераду 30 жніўня. Высяленьне адкладвалася некалькі разоў, плянавалася, што яно адбудзецца на тыдзень раней — 24 жніўня.

Тады, каб выказаць падтрымку пісьменьнікам, у Дом літаратара завітаў лідэр дэмакратычных сілаў Аляксандар Мілінкевіч. Разам з экс-старшынькай СПБ Вольгай Іпатавай Мілінкевіч прапанаваў распачаць збор грошай дзеля ўратаваньня будынку на Фрунзэ, 5. Мілінкевіч абяцаў нават грашовую дапамогу найстарэйшай творчай арганізацыі краіны, каб выратаваць гэты будынак. Аднак цяперашні старшыня СПБ Алесь Пашкевіч не ўспрыняў гэтай ініцыятывы з энтузіязмам.


ЮЛІЯ ДАРАШКЕВІЧ

Алесь Пашкевіч можа ўвайсьці ў гісторыю як старшыня, які здаў Дом літаратара.

У той самы дзень Пашкевіч патэлефанаваў кіраўніку справаў прэзыдэнта Аляксандру Кулічкову, які нібыта сказаў, што літаратараў выселяць у любым разе, нават калі яны і разьлічацца з запазычанасьцямі.

Ужо той факт, што сход Рады СПБ прызначылі на дзень высяленьня, гаварыў аб тым, што пісьменьнікі маральна падрыхтаваліся да капітуляцыі. Ідэю Іпатавай аб пачатку збору матэрыяльных сродкаў на ўратаваньне Дому літаратара падтрымаў толькі Генадзь Бураўкін. Разам з тым Генадзь Мікалаевіч прапанаваў былым дэпутатам Вярхоўнага Савету, што працавалі ў парлямэнце разам з Кулічковым, пайсьці да яго з просьбай адтэрмінаваць высяленьне, каб пісьменьнікі мелі час сабраць патрэбныя грошы. Ганаровы старшыня Беларускага ПЭН-Цэнтру Лявон Баршчэўскі падтрымаў гэтую думку, хоць і адзначыў, што ў яго з Кулічковым у свой час былі вельмі напружаныя стасункі.

Аднак Народны пісьменьнік Беларусі Ніл Гілевіч адзначыў, што не зьбіраецца ісьці з паклонам да прадстаўніка рэжыму і тым болей прасіць нешта ў яго. Тады Генадзь Бураўкін ускочыў са свайго месца, адчайна вымавіўшы: «Калі б я не пайшоў прасіць у Мін’юст, то Саюзу пісьменьнікаў даўно б ужо не было». Бураўкін сышоў з залі.

Прапановы Іпатавай заставацца ў Доме літаратара да апошняга, нават калі ўладам давядзецца выкарыстоўваць грубую фізычную сілу, ніхто не заўважыў. Дакладней, не захацеў заўважаць. Было шмат меркаваньняў і думак, але не было канструктыўных прапановаў: што рабіць пасьля высяленьня? Дзе шукаць новы юрыдычны адрас, як працягваць сваю дзейнасьць у новых умовах? Відаць, што сапраўды ніхто ня ведаў адказаў на такія пытаньні. У голасе Алеся Пашкевіча не адчувалася ні каліва аптымізму. Ён, напэўна, добра ведаў, чым усё гэта скончыцца.

Не знайшоўшы адказаў, Рада пачала прымаць у шэрагі Саюзу новых сяброў, мяркуючы тым самым паказаць, што Саюз ня зьнішчыць. Сярод іх у СПБ быў прыняты калюмніст «Нашай Нівы» эсэіст Віталь Тарас.

Пасьля гэтай працэдуры Алесь Пашкевіч прапанаваў усім пайсьці на перапынак, а ўжо потым працягнуць дыскусію. Аднак гаворкі болей не атрымалася. Праз некалькі хвілінаў у памяшканьне прыйшлі судовыя выканаўцы. Пісьменьнікі маўкліва пачалі браць партрэты сваіх знакамітых калегаў з кабінэту Максіма Танка і бясслаўна сыходзіць з Дому літаратара. Нехта выкрыкнуў фразу: «Мы сыходзім, каб вярнуцца», але яна патанула ў агульнай атмасфэры апатыі.

Сябры Рады паціху пачалі разьбягацца па сваіх справах. Як і ў 1997 годзе, калі ўлады забралі Дом літаратара ў сваю ўласнасьць, пісьменьнікі не рашыліся распачаць сапраўднае змаганьне і мабілізаваць грамадзкасьць на сваю абарону. Ня хочацца верыць, што так бясслаўна скончыцца гісторыя сапраўды ўнікальнага для беларускай гісторыі і культуры Дому літаратара.

**Зьміцер Панкавец**

**P.S.** Удава Васіля Быкава Ірына прапанавала для працы пісьменьнікаў быкаўскую дачу ў Ждановічах.

# Казацкі выбар Юшчанкі

Што робіцца ва Ўкраіне? Януковіч адбудоўвае горад Мазепы, а Юшчанка прапагандуе нацыянальную культуру. Піша **Марцін Вайцяхоўскі.**

Сёй-той сьмяецца з прэзыдэнта Віктара Юшчанкі, што ён носіць на пальцы казацкі пярсьцёнак часу Запароскай сечы, а ў яго кабінэце поўна твораў украінскага народнага мастацтва. Аднак Юшчанка такім чынам жадае вярнуць Украіне тоеснасьць, якой іх стагодзьдзямі спрабавалі пазбавіць.

На мінулым тыдні, за колькі дзён да сьвяткаваньня Дня незалежнасьці, Служба бясьпекі Ўкраіны (СБУ, аналяг нашага КДБ) апублікавала ў Інтэрнэце 5 тыс. старонак дакумэнтаў савецкага ГПУ, што тычацца галадамору 1932—1933 г. Тады памерлі некалькі мільёнаў чалавек.

Каб зразумець важнасьць гэтых дакумэнтаў, дастаткова азнаёміцца зь першым зь іх: «Дырэктывай для кіраўнікоў раённых аддзелаў ГПУ ў Крыме» ад 26 лютага 1932 г. У ёй патрабуецца «супрацьдзейнічаць вывазу хлеба па-за межы Крыму (тады тэрыторыя РСФСР) усімі магчымымі спосабамі». Чарговая тэлеграма ад 13 верасьня 1932 г. кіраўнікам аддзелаў ГПУ заклікае да ўзмацненьня барацьбы са спэкулянтамі і гандлярамі. Мова дакумэнтаў зразумелая: калі цэнтральная Ўкраіна галадала, у Крыме ежы было ўдосталь. Існавалі таксама магчымасьці яе перавозкі, бо з чарговай інструкцыі вынікае, што барацьбу з харчовымі спэкулянтамі трэба перадусім весьці на чыгунцы. Аднак савецкая ўлада не жадала, каб ежа з Крыму трапляла да галадоўнікаў Украіны.

Дакумэнты паказваюць, што голад быў выкліканы штучна, у любым выпадку, што існавалі магчымасьці, каб зьвесьці да мінімуму яго вынікі, кажа прафэсар Станіслаў Кульчыцкі, намесьнік дырэктара Інстытуту гісторыі Акадэміі навук Украіны. Ён зьвяртае ўвагу на тое, што мэтай Сталіна не было поўнае вынішчэньне ўкраінцаў як народу, а яго паслабленьне, прыгнечваньне тэрорам, каб ён падпарадкоўваўся савецкай уладзе.

— Дакумэнты дазваляюць зрэканструяваць, якія ўказаньні ГПУ атрымоўвала ад тагачасных партыйных уладаў, як іх выконвала і як потым за тое разьлічвалася, — дадае Сяргей Багуноў, дырэктар архіваў СБУ.

Сярод дакумэнтаў ёсьць акты з паказальнага працэсу над партыйнымі дзеячамі з Гарохава пад Днепрапятроўскам, якія быццам сабатажавалі загад перадачы дзяржаве ўсяго зярна, якое знаходзілася ў вёсках. Акты гэтага працэсу рассылалі потым у аддзелы ГПУ ў якасьці нагляднага матэрыялу. У архівах ёсьць таксама лісты асуджаных Сталіну, у якіх яны апісваюць жудасныя выпадкі голаду і лютасьці ГПУ ў дачыненьні да жыхароў вёскі, зь верай у тое, што правадыр пра іх ня ведае. Існуюць таксама ашаламляльныя дзёньнікі ўкраінцаў, якія перажылі голад, з успамінамі пра канібалізм, да якога тады даходзіла.

## Голад як сымбаль мартыралёгіі

Апублікаваньне дакумэнтаў упісваецца ў дзеяньні, якія можна назваць «украінскай гістарычнай палітыкай». Яна праводзіцца на працягу ўсіх 15 год незалежнасьці, але сьвядомыя рысы набыла толькі на працягу апошняга паўгодзьдзя знаходжаньня на пасадзе прэзыдэнта Віктара Юшчанкі. Прэзыдэнт хоча, каб дзяржава прапагандавала ўкраінскую гісторыю і каб гэтая прапаганда мела форму, якую будуць прымаць усе жыхары краіны, як з усходу, так і з захаду, носьбіты ня толькі ўкраінскай, але і расейскай моваў. Галадамор выконвае ролю галоўнага сымбалю, які павінен абяднаць гістарычную сьвядомасьць усіх украінцаў. Так яно і адбываецца, бо памяць пра галадамор захоўваецца ў кожнай украінскай сямі.

— Я паходжу зь вёскі ў цэнтральнай Украіне і ведаю, што пасьля трагедыі голаду людзі, якія там жылі, былі прыгнечаныя на працягу некалькіх дзесяцігодзьдзяў. Страх, што голад можа паўтарыцца, паралізаваў, быў прычынай таго, што любое супраціўленьне ўладам было цалкам выключана, — кажа ўкраінскі філёзаф, прафэсар Міраслаў Паповіч.

— Украінскае грамадзтва яшчэ да 60-х было ў сваёй большасьці вясковым, — тлумачыць сацыёлаг Яўген Галаваха. — Цяпер прапорцыі зьмяніліся да адваротнага, але вялікая частка гарадзкіх жыхароў жыве ў гарадах толькі ў першым пакаленьні. Яны ўсё яшчэ ня выракліся вясковай тоеснасьці, традыцыйных вясковых вартасьцяў, стасункаў са сваякамі, якія засталіся ў вёсцы. Таму памяць пра галадамор жыве таксама ў месьцічаў, — дадае Галаваха. Юшчанка, які сам паходзіць зь вёскі, гэта дасканала адчувае і на гэтым стараецца будаваць тоеснасьць украінцаў, каб адрозьніць іх ад расейцаў і ад тых, для каго радзімай паранейшаму зьяўляецца Савецкі Саюз.

## Калінавы гай у цэнтры Кіева

Адным з галоўных праектаў прэзыдэнта Юшчанкі зьяўляецца закладаньне ў цэнтры Кіева калінавага гаю памяці ахвяраў галадамору. Ён будзе гатовы праз год, у 75-ю гадавіну голаду, і павінен стаць помнікам украінскай мартыралёгіі.

— Калінавы гай — гэта ідэфікс Юшчанкі, — кажа Юлія Маставая, намесьніца рэдактара кіеўскага фармоўцы грамадзкай думкі — штотыднёвіка «Дзеркало Тижня». — Часам на спатканьні зь



WWW.FOR-UA.COM

Украінская гістарычная палітыка за Юшчанкам набыла сьвядомыя рысы.

**...з гэтым лічыцца нават Януковіч.**




AP

Галоўныя ўрачыстасьці Дня незалежнасьці ўпершыню адбываліся перад Сафійскім саборам, які падкрэсьлівае тысячагадовыя карані ўкраінскай дзяржавы, а не на сацрэалістычным Хрышчатыку, як раней.

міністрамі прэзыдэнт здолее адкласьці ўсе тэмы ўбок і запытацца, што адбываецца зь ягоным праектам.

Некалькі месяцаў таму з указаньня прэзыдэнта тагачасны ўрад Юр’я Еханурава павінен быў у якасьці грамадзкай працы садзіць у суботу дрэвы ў калінавым гаі. Частка прэсы абсьмяяла гэта, частка прызнала, што гэта быў добры прыклад для грамадзтва, што будуе сваю тоеснасьць. Падобным чынам трактуюцца дэманстратыўная любоў Юшчанкі да ўкраінскага народнага мастацтва, народны дэкор яго кабінэту, які яго працаўнікі зьедліва называюць «казацкай сядзібай», альбо таксама візыты на вясковыя кірмашы ў традыцыйнай вышытай кашулі, дзе Юшчанка набывае народную кераміку і расхвальвае ўкраінскую ежу і напоі.

## Забаўляльны парк на дзікіх палях

Наступным гістарычным праектам прэзыдэнта павінна стаць адбудова старажытнай казацкай сталіцы — Батурына, — што была зраўнаваная зь зямлёй расейскім царом Пятром I на пачатку XVIII ст. Некалі гэта быў прыгожы барочны горад са сьвятынямі некалькіх веравызнаньняў, тэатрам, багатай бібліятэкай, друкарняй і канцылярыяй казацкіх гетманаў. Гэта тут зьявілася першая ўкраінская канстытуцыя, напісаная Піліпам Ворлікам, сакратаром гетмана Івана Мазепы. Пасьля захопу расейскай арміяй насельніцтва Батурына выразалі пад корань, а іх целы пусьцілі Дняпром на драўляных плытах з мэтай зламаць супраціўленьне жыхароў іншых частак Украіны.

## Ахметаў адбудуе горад Мазепы

Батурын будзе адбудаваны за грошы найбагацейшага ўкраінца Рыната Ахметава, уплывовага дэпутата Вярхоўнай Рады з прарасейскай Партыі рэгіёнаў, пакравіцеля і сябра новага-старога прэм’ера Віктара Януковіча і прэзыдэнта ФК «Шахтар» (Данецк), які на мінулым тыдні прабіўся ў асноўную сетку Лігі чэмпіёнаў. Ахметаў, з паходжаньня татарын, сымбалізуе найбольш прамаскоўскі рэгіён Украіны, у паўсядзённым жыцьці размаўляе па-расейску. Нягледзячы на гэта, ён паддаўся перакананьням Юшчанкі наконт адбудовы Батурына. Падобна на тое, што каля гістарычна-музэйнай часткі павінен паўстаць гіганцкі сямейны забаўляльны парк, што будзе папулярызаваць украінскую гісторыю, звычаі, кухню. Яго фабула будзе зьвернутая да легенды казацкіх дзікіх палёў часу «Агнём і мячом». «Гэта павінна быць украінскай вэрсіяй парку Астэрыкса і Абэлікса пад Парыжам», — пісала нядаўна «Украіна Молода». Не вядома, ці той амбітны плян удасца, але калі так, то Украіна здабудзе такі сымбаль гістарычнай палітыкі ў масавым маштабе, якім у Польшчы стаў Музэй Варшаўскага паўстаньня.

Адбудова Батурына, якая, напэўна, запатрабуе некалькі соцень мільёнаў даляраў, мае і іншае значэньне. Пагаворваюць, што Ахметаў павінен такім чынам адкупіць сваю віну з пачатку кар’еры ў бізнэсе, калі на пачатку 90-х гадоў пры няясных абставінах ён зарабіў велізарныя грошы на прыватызацыі шахтаў і заводаў на Данбасе. Чуваць галасы, што па сьлядах найбагацейшага ўкраінца жадае пайсьці шмат іншых бізнэсмэнаў, сярод якіх пачынае панаваць снабізм на ўкраінскую гісторыю і мастацтва.

## УПА дзеліць

Паразай Юшчанкі скончылася пакуль спроба стварэньня супольнага ўкраінскага бачаньня II сусьветнай вайны. У стаўленьні да Ўкраінскай паўстанцкай арміі (УПА) украінскае грамадзтва падзеленае, і ўсё паказвае на тое, што будзе падзеленым яшчэ доўга, хаця робяцца спробы палагодзіць гэты падзел. На Галіччыне і Валыні партызаны УПА лічацца героямі, жыхары ўсходу ўсё яшчэ лічаць іх фашыстамі і калябарантамі, бо так дзесяцігодзьдзямі іх паказвала савецкая прапаганда. Намаганьні Юшчанкі, каб вэтэраны УПА і Чырвонай Арміі разам сьвяткавалі гадавіну заканчэньня II сусьветнай вайны, не далі плёну.

Аднак праект супольнага для ўсіх украінцаў бачаньня гісторыі дзякуючы падтрымцы дзяржавы, а таксама жэстам Юшчанкі паволі здабывае папулярнасьць. Пад знакам гэтага пытаньня прайшлі ўрачыстасьці 15-годзьдзя незалежнасьці, крыху толькі прыглушаныя жалобай, абвешчанай па аўторкавай катастрофе расейскага самалёта пад Данецкам. Галоўнае сьвяткаваньне Дня незалежнасьці ўпершыню адбылося перад Сафійскім саборам, які падкрэсьлівае тысячагадовыя карані ўкраінскай дзяржавы, а не на сацрэалістычным Хрышчатыку, як раней.

— Я веру, што Вярхоўная Рада ў хуткім часе прызнае галадамор актам генацыду супраць украінскага народу, — казаў перад саборам прэзыдэнт Юшчанка.

Ён таксама падкрэсьліў, што «няма альтэрнатывы для ўкраінскай мовы як мовы афіцыйнай», аднак разам з тым «ніякі жыхар не зазнае ўціску, калі будзе размаўляць на сваёй мове».

Папярэдні прэзыдэнт Леанід Кучма падтрымліваў бачаньне ўкраінскай гісторыі, у якім зьмешваліся казацкія, савецкія і нацыяналістычныя матывы, запазычаныя зь міталёгіі заходняй Украіны. Эфэкт быў такі, што краіна заставалася мэнтальна падзеленай, а кожны прызнаваў сваім такое бачаньне гісторыі, у якім быў выхаваны. Юшчанка прапануе мадэль, якую кожны ўкраінец можа прызнаць сваёй незалежна ад мовы, палітычных прыхільнасьцяў ці месца жыхарства. Каб пазьбегнуць супярэчнасьцяў, прэзыдэнт падаўся назад да казацтва і часу галадамору, які для ўкраінцаў набыў такую ж сымбалічную вагу, як для палякаў Катынь. Часам гістарычная палітыка Юшчанкі можа ўражваць сваёй наіўнасьцю, але да цяперашняга часу ніхто не прыдумаў лепшай праграмы для адбудовы раздробленай тоеснасьці ўкраінцаў.

**«Газэта выборча»,**
http://serwisy.gazeta.pl/swiat/0,34181.html



АНДРЭЙ ЛЯНКЕВІЧ

# Напішы палітвязьню

Яму цяпер цяжка. Твой ліст можа выратаваць яго.

220030, Менск, вул. Валадарскага, 2, СІЗА ГУУС Менгарвыканкаму, Казуліну Аляксандру.

220030 Менск, вул. Валадарскага, 2, СІЗА ГУУС Менгарвыканкаму, Дранчуку Ціmoxy.

220030 Менск, вул. Валадарскага, 2, СІЗА ГУУС Менгарвыканкаму, Астрэйку Міколу.

211652 Віцебская вобласьць, Полацкі раён, п.а. Малое Сітна, да запатрабаваньня, Севярынцу Паўлу.

212002 г. Магілёў, вул. Пушкіна, 65, ПУОТ №43, пакой 211, Фінькевічу Артуру.

247511 Гомельская вобласьць, Рэчыцкі раён, в.Баршчоўка, ВУАТ №22, Клімаву Андрэю.

225416 Берасьцейская вобласьць, Баранавічы, вул.Жукава, 12а, кв.5, Статкевічу Мікалаю.

211791 Віцебская вобласьць, Глыбокае–1, ВК–13, атрад №7, Круку Івану.

# СВАЯ АЗБУКА

Пісаў Кастусь Севярынец,
малявала Сьвятлана Баранкоўская



**Лета коціцца з гары,
Вось і восень на двары.
Вучым АЗБУКУ, сябры!**

**Гэта АЗБУКА — свая,
Бо яна ад А да Я —
Наша, БЕЛАРУСКАЯ!**

**А** Па вадзе брыдзе АЛЕНЬ,
Над АЛЕНЕМ — АВАДЗЕНЬ.

**Б** На бусьлянцы БУСЕЛ–татка
Вучыць лётаць БУСЬЛЯНЯТКА.

**В** Пад сасной сядзіць ВАВЁРКА,
Перад ёю — шышак горка.



**Г** ГАРБУЗЫ ў ГАРОДЗЕ сьпеюць
На прыпёку пузы грэюць.

**Д** ДУБ рассыпаў жалуды,
Бо зьбіраць няма куды.

**ДЖ** З мамай мы хадзілі ў краму,
ДЖЫНСЫ мне купіла мама.





**ДЗ** ДЗІК прыбег пад грушку–ДЗІЧКУ,
Дзе з крынічкі п’е вадзічку.



**Е** ЕЛКА зь лесу на Каляды
Завітае ў нашы хаты.




**Ё** На сьняданак ЁГУРТ маю —
вітаміны спажываю.



**Ж** Не злуе ніколі ЖОРАЎ,
У яго лагодны нораў.



**З** ЗУБР — ня проста мажны бык:
Белавежы — вартаўнік.

**І** ІНДЫК шукае індыка,
Бо сумна жыць безь сябрука.





**Й** ЙЕС! — з ангельскай мае быць.
Так! — па-нашаму гучыць.

**К** КОЦІК сам з сабой гуляе,
Ён свой хвосьцік даганяе.

**Л** Зь ЛЕСУ выйшаў ЛОСЬ рагаты,
Побач з бацькам — ласяняты.





**М** А МЯДЗЬВЕДЗЬ, калі зіма,
Сьпіць — і клопату няма!

**Н** Важкі колас сьпеліць НІВА —
Слава сейбітам руплівым.





**О** ОРДЭН — гэта ўзнагарода
Тым героям, што з народам.



**П** ПЕЎНІК зранку запяе,
Сьледам сонейка ўстае.

**Р** РЫСЬ пабачыш — сьцеражыся,
Лепей з РЫСЬСЮ разысьціся!



**С** Сьпіць САВА ў дупле ад раньня,
Ноччу будзе паляваньне!



**Т** ТРАКТАР самы знакаміты —
«Беларус» наш цягавіты.





**У** УЗОР прыгожы на кашулі
УНУКУ вышыла бабуля.

**Ў** Калі коска зьверху ўецца,
Нескладовым У завецца.



**Ф** ФУТРА цёплае ў лісіцы,
Вось дзе шапка й рукавіцы!



**Х** ХЛЕБАМ–сольлю найчасьцей
Сустракаем мы гасьцей.

**Ц** ЦЬВІК з ЦАГЛІНАЙ не сябруюць,
Але разам дом будуюць.





**Ч** ЧАПЛЯ ходзіць ля ЧАРОТУ,
Не патрэбны чаплі боты.



**Ш** ШЧУПАК пабачыў рыбака
Задаў адразу драпака.



**Ы** Мяккі знак з кійком ідзе,
За сабою Ы вядзе.



**Ь** Пра яго мы скажам так:
Мякчыць мову мяккі знак.

**Э** ЭКСКАВАТАР робіць лоўка,
Адпачні пакуль, рыдлёўка.





**Ю** ЮШКА смачная, з наварам...
Пачастуйся з пылу, з жару!

**Я** ЯБЛЫК падае да долу —
Кліча верасень у школу.




**Яна зь Янкам вучаць зранку**
**Сваю азбуку-чытанку.**

**Вабяць іншыя спакусы,**
**Але ж дзеткі — БЕЛАРУСЫ!**
**Да вучобы здатныя,**
**Вучні зь іх — выдатныя!**

**Аўтары дзякуюць паважанаму доктару філялягічных навук прафэсару Івану Чароту за каштоўныя парады пры складаньні азбукі.**

# У Гальшанах зруйнавалі будынак колішняга габрэйскага банку

У Гальшанах будуюць аграгарадок. Кладзецца новы брук на ходніках, перамалёўваюцца фасады дамоў, рамантуюцца сталоўка, дом быту і інш., перад будынкам адміністрацыі зьявіцца помнік Соф'і Гальшанскай.

Будучы там зь невялічкай групай студэнтаў 24 жніўня падчас экспэдыцыі-вандроўкі Беларускай асацыяцыі студэнтаў-архітэктараў, акрамя станоўчых зьменаў па добраўпарадкаваньні цэнтру мы былі зьдзіўленыя руйнаваньнем колішняга будынку былога габрэйскага банку. Магчыма, у гэтыя хвіліны будынак ужо зьнік.

Гэты двохпавярховы будынак першай траціны XX ст. месьціцца на рагу Замкавай і Трабскай вуліц, што выходзіў бакавым фасадам на галоўную плошчу мястэчка насупраць касьцёлу, падтрымліваючы такім чынам архітэктурны ансамбль цэнтральнай часткі плошчы мястэчка. Будынак належаў мясцоваму калгасу «Гальшаны», які некалькі год таму аб'яднали зь іншымі ў адзін вялікі калгас. Кіраўніцтва аб'яднанага калгасу месьціцца ў іншым месцы, таму будынак апошнім часам практычна пуставаў. Толькі першы паверх займала бібліятэка і аддзяленьне «Беларусбанку». Яшчэ год таму мы, студэнты, тут, у гэтым будынку, жылі і праводзілі архітэктурны летнік разам з нашымі калегамі з Польшчы. А два гады таму іншыя польскія студэнты-архітэктары таксама падчас летніка рабілі нават эскізны праект рэканструкцыі будынку пад гатэль і кавярню, бо гэтага хацеў кіраўнік раёну ў размове з кіраўніцтвам нашага факультэту (я тады таксама прысутнічаў). Калі мы жылі тут падчас летнікаў, мы не заўважылі асаблівых праблемаў у канструкцыі будынку. Добра памятаю, як кожны дзень нам было прыемна прачынацца пад гук званоў касьцёлу, адсюль адкрываўся добры від на плошчу й касьцёл, а ў бібліятэцы была ўся патрэбная літаратура.







**Праекты рэканструкцыі і этапы дэструкцыі габрэйскага банку ў Гальшанах.**

Будынак быццам бы Гарадзенскае МНС прызнала аварыйным дзеля слабых муроў і фундамэнтаў. Стала вядома, што на месцы будынку мусіць зьявіцца аўтастаянка. Між тым работнікі, якія разьбіралі будынак, апавялі, што сьцены ў нармальным стане.

Будынак, хоць не такі стары і ўнікальны, але важны з гледзішча фармаваньня архітэктурнага асяродзьдзя Гальшанаў, яго было відаць з розных важных месцаў. Тым больш што пужае любы прэцэдэнт: а што калі наступным будзе лякарня насупраць, дзеля дрэннага санітарнага стану? І дзе выкананьне праграмы па разьвіцьцю турызму, калі хутка няма што будзе глядзець? Побач стаіць савецкі аднапавярховы будынак Дома быту, і яго чамусьці рамантуюць, а помнік архітэктуры разбураюць!

Вядома, трэ было перакласьці драўляныя бэлькі і падлогу на другім паверсе, зрабіць нармальную гідраізаляцыю фундамэнту, але руйнаваньне помніка архітэктуры — гэта ня выйсьце. Калі і сапраўды былі праблемы, то тут тады мусяць працаваць рэстаўратары, але не руйнавальшчыкі. Гэта страшна, калі адчуваеш, што праз адсутнасьць у кагосьці глуздоў і прадбачлівасьці мы страчваем суцэльнасьць нашай культуры, а ў гэтым выпадку ўнікальны ансамбль гістарычнай забудовы Гальшанаў.

**Зьміцер Савельеў,**
*старшыня моладзевага грамадзкага аб'яднаньня «Беларуская асацыяцыя студэнтаў-архітэктараў», студэнт 5 курсу архітэктурнага факультэту*

# Брудная работа ў нуль

Прадпрыемствы па перапрацоўцы адкідаў адстаюць ад культуры народу.

Ужо два месяцы дзейнічае указ прэзыдэнта, паводле якога імпартэры і вытворцы плястыкавай прадукцыі альбо прадукцыі, запакаванай у гэтую тару, мусяць плаціць каля 240 тыс. з тоны гэтай сыравіны на яе перапрацоўку. Нешта падобнае існуе і ў Эўропе. Але там заканадаўствам замацаваны абавязак вытворцы і гандлёвай фірмы прымаць назад і перапрацоўваць упакоўку пасьля выкарыстаньня спажыўцом. Займацца гэтай справай паасобку немэтазгодна, таму з ініцыятывы гэтых фірмаў была створана прыватная схема ўтылізацыі — «дуальная сыстэма», якая ўзяла на сябе выкананьне гэтых задачаў. Тысячы фірмаў непрымусова прынялі рашэньне ўдзельнічаць у гэтым працэсе. Сплаціўшы грошы за паслугу, яны атрымліваюць права пазначыць сваю ўпакоўку «зялёнай кропкай». Паводле гэтага сымбалю спажывец даведваецца пра перапрацоўку тары і вяртае яе назад. У Беларусі гэтую ролю на сябе ўзяла дзяржава.

Паводле зьвестак канцэрну «Белрэсурсы», штогод у Беларусі ўтвараецца 900 тыс. тон патэнцыйнай другаснай сыравіны, а перапрацоўваецца 240 тыс. на суму $20 млн.

У Магілёве быў пабудаваны перапрацоўчы завод плястыку магутнасьцю 7 тыс. тон, у краіне ўведзены асобны збор сыравіны, але на сёньня загружанасьць прадпрыемства — 2,5 тыс. тон пэт-бутэлек. Утвараецца ж штогод 13 тыс. (300 млн штук). «Арганізацыя матэрыяльна-тэхнічнай базы для збору пэт-бутэлек патрабуе вялікіх выдаткаў, — тлумачыць начальнік аддзелу другаснай сыравіны канцэрну «Белрэсурсы» Анатоль Яцук. — Цяпер у гэтай сыстэме працуе каля 150 аўтамабіляў і 20 прэсаў коштам 200 млн рублёў кожны. Абсталяваньне перапрацоўчага заводу абышлося ў 2 млн эўра. Але і з такім абсталяваньнем мы адстаём, можна сказаць, ад культуры народу. Спажыўцы гатовыя да асобнага збору, яны і перапаўняюць нашыя бакі, а мы не пасьпяваем за імі».

Зь перапрацоўкай паперы і шкла паўстаюць іншыя пытаньні. Прадпрыемствы напоўніцу загружаныя, але адкідаў утвараецца ў 2—3 разы болей. Востра адчуваецца патрэба павелічэньня вытворчых магутнасьцяў, а гэта таксама патрабуе вялікіх укладаньняў.

Паводле словаў Анатоля Яцука, айчынныя прадпрымальнікі таксама цікавяцца гэтым кірункам, а тыя, што ўжо займаюцца зборам ці перапрацоўкай, робяць гэта больш пасьпяхова, чым дзяржава. Але сур'ёзных інвэстыцыяў зь іх боку чакаць не даводзіцца. Падатковай сыстэмай ня ўлічаныя асаблівасьці работы з другаснай сыравінай. Тое, што сыравіна зьбіраецца, а не набываецца за грошы, уплывае на заліковы ПДВ. Урэшце, ад цаны продажу на падаткі пойдзе прыкладна 40%. З астатніх грошай бізнэсовец мусіць сабраць, перапрацаваць, сплаціць падатак на зямлю (патрэбна вялікая плошча для назапашваньня, дасартоўкі і г.д.), экалягічны збор, выплаціць заробкі.

«За 2005 год рэнтабэльнасьць прадпрыемства склала меней за 10%, — скардзіцца ўладальнік УП «Белзьнешпрадукт» Валеры Кот. — Калі я пачынаў займацца гэтым напрамкам у 1994 годзе, гэта лічба была 56%. Тады перапрацоўвалі галоўным чынам адкіды прадпрыемстваў, іх аддавалі за невялікія сродкі. Сёньня ў выніку розных пераўтварэньняў тону адкідаў прадпрыемства прадае прыкладна за $500. Каб атрымаць другасную сыравіну таньней, уздоўж галоўнага праспэкту Менску былі ўсталяваны нашыя кантэйнэры для адкідаў спажыўцоў. Але таньней не атрымалася».

Паводле словаў сп.Валера, больш пасьпяхова займацца гэтым напрамкам можна толькі пры наяўнасьці ільгот і магчымасьці іх ажыцьцяўленьня. Законам «Аб ахове навакольнага асяродзьдзя» і законам «Аб адкідах» прадугледжаныя ільготы ў падаткаабкладаньні юрыдычных асобаў і прыватных прадпрымальнікаў, крэдытаваньне мерапрыемстваў па ахове навакольнага асяродзьдзя з рэспубліканскіх і мясцовых бюджэтаў. Але грошы там знаходзяцца толькі для дзяржаўных праграмаў.

Акрамя гэтага, дзейнасьць такога прадпрыемства заўсёды пад пільным вокам пажарных ды санэпідэмстанцый. Папера і плястык — пажаранебясьпечныя, у бутэльках застаюцца рэшткі напояў, і летам на іх пах зьлятаюцца восы. «Да нас прыходзіць шмат энтузіястаў, многія спрабавалі працаваць, але безь дзяржаўных ільгот і разуменьня ўсімі гэтымі службамі нашых праблемаў хаця б на першапачатковым этапе выжыць прадпрыемству амаль не магчыма. Усё, чым я магу іх сёньня падтрымаць, гэта дамагчыся ад Мінпрыроды часовага вызваленьня ад экалягічнага падатку», — пераживае спадар Яцук.

**Тацяна Гацура**

### За год у Беларусі

**утвараецца 31 млн тон адкідаў. Зь іх 900 тыс. мусяць перарабляцца на другасную сыравіну. З 570 тыс. тон макулятуры перапрацоўваецца 240 тыс., з 27 тыс. тон плястмасаў — 2,5 тыс.**

**Магутнасьць шклоперапрацоўкі складае 60 тыс. тон у год пры ўтварэньні 150 тыс. У выніку пераходу шэрагу прадпрыемстваў на фірмовую тару дадаткова неабходна перапрацаваць 180 тыс. тон (500 млн. бутэлек).**

# Жніво ў лічбах

Як паведамляе Міністэрства сельскай гаспадаркі, па стане на 30 жніўня было намалочана 5 млн. 486 тыс. т — то бок на 754 тыс.т менш, чым летась на гэтую дату.

Найбольш намалацілі на Меншчыне: звыш 1,5 млн.т. На Гараденшчыне сабрана 1 млн. 89 тыс.т зерня, Берасьцейшчыне — 780 тыс.т, Магілеўшчыне — 744 тыс.т, Гомельшчыне — 692 тыс.т, Віцебшчыне — 676 тыс.т.

Скошана зерневых з 1 млн. 885 тыс.га (86,2%). У Берасьцейскай вобласьці не апрацавана 4,6% плошчы, у Гарадзенскай — 4,4%, у Гомельскай — 10,2%, у Менскай — 14,8%, у Магілеўскай — 24,4%, у Віцебскай — 24,3%.

На ўласных падворках сабралі зярна з 20% плошчы (91 тыс.т.). Ураджайнасьць на Віцебшчыне й Магілёўшчыне найменшая, а палі найбольш пацярпелі ад залеваў, таму можна чакаць, што агульны збор складзе сёлета каля 6,0-6,2 мільёнаў т.

**СП**

# Чалавек Плошчы, ня дай сябе зламіць

Мы паспыталі ў рэальнасьці тое, што нашы аднагодкі на Захадзе маюць у сурагатнай форме. Піша Андрэй Баранаў.


WWW.SVABODA.ORG

**Мікалай Ільлін (нясуць на руках), які здолеў пранесьці ў намётавы гарадок біятуалет, хоць і быў зьбіты АМОНам.**

Калі сытуацыя крытычная, калі рашэньне трэба прымаць хутка і наступствы яго непрадказальныя — тады розум і пачуцьці адыходзяць на задні плян. На мяжы рэальнай небясьпекі выяўляюцца сапраўдныя каштоўнасьці чалавека — тое, чым ён ёсьць і дзеля чаго жыве.

У сакавіку-2006 Ты ня ведаў, чым скончыцца Тваё стаяньне на Плошчы. «Прэзыдэнт» абяцаў «зьвярнуць шыю», камандзір АМОНу — пакласьці «мордай на асфальт». Старшыня КДБ пагражаў крымінальнай справай за тэрарызм і васьмю гадамі турмы. Генпракурор — расстрэлам.

Ты, мабыць, памятаеш, як увечары 21 сакавіка Слава Сіўчык сказаў, што «да нас едуць войскі». Як уздрыгваў ад грукату цяжкіх машын і ўсё адно заставаўся на ноч у прадчуваньні «зачысткі». Я ўжо не кажу пра пагрозу звальненьня з працы і выключэньня з ВНУ — гэта, як кажуць, «само сабой».

Я ўпэўнены, што ва ўмовах такой рызыкі Ты, мабыць, упершыню ў жыцьці дзейнічаў у згодзе з сваімі сапраўднымі перакананьнямі і ідэаламі. І ў тым бачу асноўную вартасьць Сакавіка для Тваёй біяграфіі — шанец спазнаць сябе.

Твае аднагодкі на Захадзе лезуць у горы, едуць у гарачыя кропкі, арганізуюць антыглябалісцкія дэманстрацыі. І ўсё дзеля таго, каб у сурагатнай форме паспытаць тое, што Ты паспытаў насамрэч — рэальны выбар і рэальныя выпрабаваньні.

Таму скарыстай гэты шанец. Можаш узяць чысты аркуш паперы і напісаць самому сабе адказ на пытаньне: «Што прывяло на Плошчу асабіста мяне?» Тое, што Ты напішаш, і ёсьць Тваёй Сутнасьцю. Тое, што робіць Цябе чалавекам — і асобай.

Слабыя людзі — цынікі, скептыкі, баязьліўцы — будуць дзівіцца і сьмяяцца з Тваёй шчырасьці. Яны паспрабуюць пераканаць Цябе, што Ты дзейнічаў пад уплывам эмоцый, маніпуляцый, наіўнасьці, максымалізму, дзеля вострых пачуцьцяў, каб эміграваць, ад няма чаго рабіць і г.д.

Ня вер. Там, перад тварамі выпадковых сяброў, перад тварамі людзей, што несьлі Табе пітво, ежу і адзеньне, перад тварамі правакатараў і амапаўцаў, Ты і быў сапраўдным.

Час ад часу перачытвай напісанае Табою цяпер. Успамінай сябе. У паўсядзённай руціне лёгка забыцца на свае каштоўнасьці — адзіна надзейны падмурак, на якім будуецца годнае жыцьцё.

Стань сабой, Чалавек Плошчы, і ня дай сябе зламіць. Дзякуй Табе.

З павагай,

*baranau@tut.by*

# Малое Сітна



**Павал Севярынец** — у 1998—2004 лідэр незарэгістраванага «Маладога фронту». Асуджаны за арганізацыю акцыяў пратэсту пасьля рэфэрэндуму 2004 году. Цяпер у высылцы ў Малым Сітне, на поўначы Полаччыны.

## ПАВАЛ СЕВЯРЫНЕЦ

Верасень. Са школьных гадоў падхлынае падсьвядома настрой: «вучыцца, вучыцца й яшчэ раз вучыцца».

Новы *навучальны год* арганізавалі мне і ў спэцкамэндатуры: ва ўмоўна-датэрміновым вызваленьні адмоўлена («ня стаў на шлях раскаяньня і супрацоўніцтва з адміністрацыяй»). Значыць, Богу ўгодна, каб Сітна навучыла мяне яшчэ нечаму.

З новага навучальнага году «Гісторыю Беларусі» пачынаюць пераводзіць на расейскую. У Сітне гэтыя падручнікі пакуль што па-беларуску, хаця й платна — кошты за год карыстаньня расьпісаныя для кожнае клясы й расклееныя ў абвестках па леспрамгасе. Зрэшты, калі добра пакапацца, любая беларуская вёсачка — самы жывы й бясплатны падручнік па гісторыі Беларусі.

Вось, прыкладам, тое ж Малое Сітна з навакольлем....

Разьмешчаная ля вытоку Палаты з возера Ізмок, у нейкай паўсотні кіляметраў ад Полацку, вёска так і просіцца ў сьпіс старажытных паселішчаў *палачанаў*. Тысячагодзьдзе таму, калі галоўнымі шляхамі ў гэтым лясным ды балоцістым краі былі рэчкі: ці мог Рагвалод абмінуць гэткі выгодны стратэгічны пункт сваіх уладаньняў? За 10 км ад Сітна на лясных ручаях знойдзеныя дзіўныя вялікія колы, запоўненыя смалой. Вельмі падобна на прыкметы старажытнага *волаку*, калі ўлічыць, што Палата геаграфічна ўлучаецца ў адну з вэрсіяў шляху з «варагаў у грэкі»...

А калі дадаць, што праз Малое Сітна праходзіць яшчэ й стары гасьцінец з Полацку на Невель і далей да Пскова ды Ноўгараду Вялікага, дык ці ня тут у 980-м ішоў на Полацак Уладзімер?.. І ці ня гэтай лясной дарогаю ўжо ў 1066-м Усяслаў Чарадзей вырушыў здымаць званы з Сафіі Наўгародзкай?..

Дзесьці ў гэтых мясьцінах — ваколіцах Полацку, — паводле паданьня, на мяжы І і ІІ тысячагодзьдзяў прапаведаваў і быў пахаваны славуты Торвальд Вандроўнік, адзін зь першых хрысьціянскіх місіянэраў у Беларусі. Гісторык Алесь Белы выслаў мне вытрымку зь «Беларускай энцыкляпэдыі», дзе як на адно зь верагодных месцаў магілы Торвальда (высокая гара ў *Дрофне*) указваецца на Дрэтунь (8 км нацянькі ад Сітна).

Вось вам, калі ласка, і разгорнутая ілюстрацыя да тэмы пашырэньня хрысьціянства, заснаваньня беларускай дзяржаўнасьці й змаганьня за незалежнасьць — у адным асобна ўзятым сельсавеце.

У 1563-м, на пачатку Інфлянцкай вайны, стратэгічнае становішча Сітна ацаніў Іван Жахлівы — і пабудаваў на насыпаным узгор'і ля вытокаў Палаты, якраз насупраць вёскі, драўляную фартэцу. У 1566-м вялікалітоўскі ваявада Біруля фартэцу спаліў. Маскавіты ізноў адбудавалі ўмацаваньне — але пасьля вяртаньня Полацку ў 1579-м Сьцяпан

## ХРОНІКА

**23 жніўня**

Каля Цэнтральнага РУУС у Менску затрымалі моладзевых актывістаў **Юлію Гарачку, Яўгенію Ёкшу, Лілію Міхайлаву, Лілію Давыдоўскую, Міхаіла Субача, Уладзімера Лукшу** і **Віктара Дзенісовіча**: яны раздавалі міліцыянтам улёткі з заклікам берагчы гонар мундзіра. Гарачку асудзілі на 4 сутак арышту, Міхайлавай, Ёкшы, Дзенісевічу і Лукшы прысудзілі штраф 20 базавых велічыняў (620 тыс. руб.), Давідоўскай — 29.

У віцебскім судзе апраўдалі актывіста ПБНФ **Кастуся Смолікава**: яго вінавацілі ў дастаўцы й распаўсюдзе нелегальнай друкаванай прадукцыі. Аднак суд улічыў, што актывіст нават не трымаў у руках пакунак, які загадзя пасьпелі канфіскаваць міліцыянты.

У Менску падчас распаўсюду запрашальнікаў на дазволены канцэрт «Песьні Свабоды» затрыманыя **Віталь Стажараў, Ірына Анцілеўская з 7-гадовай дачкой**, а таксама **тры 16-гадовыя школьніцы**.

Палітвязьню **Мікалаю Статкевічу** падкінулі ў аўтамабіль шпрыц з рэшткамі бясколернай вадкасці й моцным пахам.

**24 жніўня**

На мяжы правялі нагляд аўтамабіля і асабістых рэчаў кіраўніка АГП **Анатоля Лябедзькі** й кіраўніка ПКБ **Сяргея Калякіна**, калі палітыкі ехалі ў Вільню.

У Вялейцы затрымалі моладзевага актывіста **Юрася Палонскага**: міліцыянты заявілі, што ў яго можа быць выбуховае прыстасаваньне. Пратакол на хлопца не склалі.

**Сяргея Панамарова** ў Клецку выклікалі ў пашпартны стол: міліцэйскае кіраўніцтва цікавілася ў яго плянамі апазыцыі ды прычынамі таго, чаму ён падаў заяўку на мітынг.

**25 жніўня**

У Менску перад канцэртам «Песьні Свабоды» міліцыянты папярэдзілі **В.Стажарава**, **Аляксандра Спрагоўскага** і **Яўгена Навінскага**, якія ішлі зь сьцягамі АГП.

Актывіста БСДП(Г) **Алега Волчака** 2 гадзіны трымалі на мяжы пры ўезьдзе ў Беларусь: памежнікі раіліся зь Менскам.

# ад Рагвалода да Мілінкевіча

Батура штурмам узяў Сітна і зьнішчыў стралецкую залогу.

Знаходка Андрэя Катлерчука, гісторыка з унівэрсытэту Стакгольму, які даведаўся пра кальвінісцкага шляхціца, высланага на пажыцьцёвую службу ў «Замак Сітна на мяжы з Расеяй» у сярэдзіне XVIII ст., пераконвае, што зруйнаваная Батурам фартэца была адноўленая як памежны замак (найверагодней, пасьля Андрусаўскага міру 1667 г.) і функцыянавала, падобна, да самага 1-га падзелу Рэчы Паспалітай 1772 г.

Сіценскія карані ўгадваюцца і ў прозьвішчы Сімяона Полацкага: *Пятроўскі-Сітняновіч*. І хаця Сітняновічам звалі айчыма Сімяона, а сапраўдны ягоны бацька меў прозьвішча Пятроўскі, але ля той жа Дрэтуні, па дарозе з Полацку да Сітна, знаходзім і вёсачку *Пятроўшчына*.

У 1812-м па дарозе Полацак—Невель на Пецярбург наступаў корпус напалеонаўскага маршала Сэн-Сіра. Не даяжджаючы Дрэтуні, падарожнік з Полацку заўважыць указальнік: «Конны Бор. 2 км». Тады, два стагодзьдзі таму, у гэтым месцы стаяла кавалерыя Сэн-Сіра. Корпус, спынены расейцамі ў бітве пад Клясьціцамі (каля 7 км ад Сітна, на мяжы з Расеяй), заняў пазыцыі й зрабіў фартыфікацыйныя ўмацаваньні якраз у раёне Алёшчы — Сітна. Расказваюць, што яшчэ ў 70-я гады мінулага стагодзьдзя сюды, на хутар Асоўцы, што ў 3 км ад Сітна, прыяжджала піцерская экспэдыцыя з мэталашукальнікамі, спрабуючы знайсьці шматпакутныя «напалеонаўскія скарбы».

Сітна тройчы згадваецца ў «Шляхціцу Завальні» Яна Баршчэўскага...

Перакананы: ніякая «Лінія Сталіна» ня вытрымае прамое канкурэнцыі з маласіценскім турысцкім маршрутам. Тым больш, што ў 1944-м, падчас савецкай апэрацыі «Багратыён» на паўднёвай ускраіне Сітна (хутар Мураўішча) знаходзіўся штаб І Прыбалтыйскага фронту. Вяскоўцы, паказваючы былы будынак штабу, зьездліва камэнтуюць: «Бач, генэрал Баграмян спрытны быў — хату заняў самую маленькую, але ж каля лесу. Чуць нямецкі налёт, скокнуў з парога — і ‘дразу ў хмызьняк».

Лукашэнка за ўсе 12 гадоў у сіценскім сельсавеце так і не пабываў — таму й ягонага сьледу ў нашым падручніку гісторыі не застанецца. Затое і Алёшчу, і Малое Сітна ў 2005—2006 г. наведваў Аляксандар Мілінкевіч...

У Новай Беларусі — Беларусі Адраджэньня, эўрапейскай адукацыі й моцнага мясцовага самакіраваньня — кожная вёсачка й кожны горад будуць на правах школьнага прадмету вывучаць побач з нацыянальнай гісторыяй і *сваю ўласную гісторыю на сваёй роднай мове*.

Бо ці ж не з усьведамленьня, *хто мы, адкуль мы й куды мы ідзём*, пачынаецца нацыянальнае абуджэньне?

*в.Малое Сітна*

*www.seviarynets.net*

«Лінія Сталіна» ня вытрымае прамое канкурэнцыі з маласіценскім турысцкім маршрутам.

## ХРОНІКА

У офіс пратэстанцкай **царквы «Новае жыцьцё»** прыйшлі пастановы апэляцыйнай камісіі гаспадарчага суду Менску з двух паседжаньняў, хаця прадстаўнікам суполкі паведамілі загадзя толькі пра адно зь іх.

**27 жніўня**

Падчас моладзевага футбольнага турніру «За свабоду і незалежнасьць» міліцыянт затрымаў **Ільлю Богдана** і **Вольгу Гудкову**, якая фатаграфавала затрыманьне. Таксама забраў расьцяжку з назвай турніру. Была спроба ўвогуле сарваць турнір: дамова на арэнду стадыёну была раптоўна скасаваная.

У Салігорску на Дзень гораду міліцыянты сарвалі нацыянальны сьцяг з гаўбца прыватнай кватэры над цэнтральнай плошчай. Моладзевага актывіста **Андрэя Тычыну** затрымалі двойчы: удзень ён узьняў бел-чырвона-белы сьцяг над плошчай, увечары — падчас вывешваньня транспаранту «Мы памятаем».

**28 жніўня**

На **Ігара Кулея** (пасынка Аляксандра Мілінкевіча і сына Іны Кулей) пачалі крымінальную справу: яго вінавацяць ва ўхіленьні ад войска, хаця хлопец ужо чацьверты год вучыцца ва ўнівэрсытэце ў польскім Ольштыне.

На газэту ПКБ «Товарищ» і прафсаюзнага актывіста суполкі таксоўцаў **Паўла Паддубскага** пададзены пазоў на 30 млн руб.: старшыня асацыяцыі «Сталічнае таксі» **Ігар Верхавец** палічыў абражаным свой гонар і годнасьць. У газэце распавядалася пра праблемы таксоўцаў і адзначалася, што асацыяцыя пазбаўляецца канкурэнтаў.

За «мінаваньне» **офісу ПБНФ** у аддзеле міліцыі Савецкага раёну распачалі крымінальную справу па факце хуліганства.

У Драгічыне зьбілі актывіста БНФ **Васіля Prакопчыка**: ягонаму земляку Аляксандру Бялкову не спадабалася, што той распаўсюджвае ў горадзе незалежную прэсу. Выкліканыя міліцыянты засьведчылі, што нападнік п'яны, але затрымліваць яго адмовіліся.

**АШ**

# Маштабная рэклямная акцыя з дазволу Адміністрацыі прэзыдэнта


PHOTO.BYMEDIA.NET

Было прададзена толькі 3500 квіткоў. Пры тым што ў любой эўрапейскай сталіцы «The Cardigans» сольна зьбіраюць як мінімум удвая большую аўдыторыю.

Падчас канцэрту ў менскім аэрапорце «The Cardigans» крычалі «Жыве Беларусь!». Рэпартаж **Алеся Квіткевіча.**

Доўгачаканы выступ зорак сучаснага моладзевага року — швэдзкай групы «The Cardigans», а разам зь імі й такі рэдкі ў нашых цяперашніх рэаліях open air фэстываль прайшоў амаль бездакорна ў пляне арганізацыі, з аднаго боку, а з другога боку, самі ж арганізатары мерапрыемства — вытворца бульбяных чыпсаў «Estrella» — не хавалі сваёй незадаволенасьці: афіцыйна было прададзена толькі тры з паловай тысячы квіткоў. Гэта пры тым, што адныя толькі «Камізэлькі», як літаральна перакладаецца з ангельскай назва скандынаўскай рок-каманды, у любой эўрапейскай сталіцы сольна зьбіраюць як мінімум удвая, а то і ўтрая большую аўдыторыю. А ў Менску разам зь імі выступалі «Uma2rman», «Город 312», «J:МОРС» ды яшчэ тройка беларускіх гуртоў у дадатак.

Арганізатары зрабілі вялізную прамоцыю падзеі — рэкляма, уласна, была ня рок-музыкі, а чыпсаў. Зрэшты, так яно й мелася быць, бо афіцыйна мерапрыемства называлася «Рэклямная акцыя па прасоўваньні на рынку Беларусі вытворчасьці гандлёвае маркі «Estrella». Зь іншага боку, яны збаяліся выпусьціць на сцэну хоць які «непажаданы» гурт, і вінаваціць іх у гэтым складана: інакш Star Show папросту не адбылося б. Рок-канцэрт у цэнтры гораду быў дазволены Адміністрацыяй прэзыдэнта, аб чым прысутным неаднаразова нагадалі. Сто кіляват гуку адмыслова былі прывезеныя з Масквы, разам з майстрамі, якія за гэтым гукам працавалі.

У якасьці апэрытыву на сцэне зьявіліся «beZ bileta», якія чамусьці самі сябе назвалі пачаткоўцамі, і, тым ня менш, з парай новых песень публіцы яўна спадабаліся. Троху меншы посьпех мелі іхныя наступнікі на сцэне: Валік Грышко з сваёй камандай «Усе» і нэарамантыкі з «Neo».

Потым на сцэну выйшаў гурт, які стаў на апошняй «Рок-каранацыі» гуртам году з салістам у саколцы з Чэ Геварай і армейскіх нагавіцах колеру хакі. Дарэчы, у вайсковых штанах будзе выступаць і другі Ўладзімер — Крастоўскі, саліст гурту «Uma2rman». «Морсы» зайгралі старыя гіты й дзьве новыя песьні: «Не памірай» і даведзеную да ладу беларускамоўную кампазыцыю «Паветра».

Сцэнаў было дзьве, і адразу за беларусамі на сцэне за нумарам 2 зьявіліся ультрапапулярныя цяпер у Расеі аўтары песень з апошніх кінагітоў: «Дзённы дазор» і «Піцер FM» — гурт «Город 312». Пасьля адной зь песень салістка калектыву пажартавала: «Як добра, што ў вас ёсьць музычныя каналы!»

Раней мне здавалася, што відэааматары ў міліцэйскай форме прысутнічаюць толькі на акцыях апазыцыі. Якім жа было маё зьдзіўленьне, калі побач з пажарнікамі ўзгрувасьціўся міліцыянт з камэрай у руках!

Увогуле, правілы паводзінаў у нас у параўнаньні з такога кшталту мерапрыемствамі ва Ўкраіне даволі жорсткія. Пра іх неаднаразова паведамілі праз гукаўзмацняльнікі яшчэ перад пачаткам канцэрту. Затое й падпітых у параўнаньні з той жа Ўкраінай было значна меней. І гэта, безумоўна, плюс. Паліць не дазвалялі нават у VIP-зоне, куды квіткі каштавалі ні многа ні мала 250 тысяч рублёў. Калі шоў падыходзіла да заканчэньня і ўсе музыкі выйшлі паглядзець на апошніх выступоўцаў — разынку вечара, стакгольмскі рок-гурт «The Cardigans», — у мэтры ад мяне да музыкаў гурту «Uma2rman» падышоў супрацоўнік спэцназу і ня тое каб вельмі ветліва папрасіў затушыць цыгарэты. Тыя былі ў шоку...

Другі міліцыянт, угледзеўшы, як нехта з фанатаў разгарнуў швэдзкі сьцяг, падышоў да свайго калегі ды падазрона кіўнуў: маўляў, мо гэта таксама незарэгістраваная сымболіка? Сяржант, мабыць, больш дасьведчаны ў геральдыцы, пасьміхнуўся ды сказаў: «Не, гэта можна...» Адзін мой знаёмца пасьля слова «fucking» у адной зь песень швэдаў пажартаваў: добра, нашыя органы кепска разумеюць па-ангельску... Дарэчы, тое самае вышэйзгаданае амаль што ўжо нарматыўнае ангельскае слова выклікала найбольш жвавую рэакцыю сярод таксама ня вельмі абазнанай у ангельскай мове менскай публікі. Праўда, да таго, як група выйшла на біс, — але пра гэта ніжэй...

У астатнім жа ахоўнікі паводзіліся зычліва, значкаў «За Свабоду!» не адбіралі. Некаторыя нават усьміхаліся на іх. Ну, як тут пасьля такога не зрабіцца зацятым аптымістам?!

Што да самога выступу легенды сучаснага року, то апісаць яго можна даволі ляканічна: моцна і стылёва. Адно адчувалася, што нават халодныя скандынавы не зусім разумелі нашае прыроднае ціхмянасьці ды нейкае ўнутранае заняволенасьці. Праўду казаўшы, напачатку вакалістку «The Cardigans» гэта крыху бянтэжыла. «Менск, вы такія ціхія...» — заўважыла неяк яна. А бліжэй да сярэдзіны выступу швэдзкая рок-князёўна нават удала робленага храпака: маўляў, сьпіцё, таварышы... Але на біс усё ж выйшла. І як! Пасьля апошняй у трэклісьце гітовай кампазыцыі «Favourite Day», пад якую, нарэшце, адрывалася напоўніцу ўся публіка, бо яе ведаў, бадай, кожны прысутны, салістка стакгольмскіх «Камізэлек» разьвіталася з удзячнымі слухачамі словамі «Good night!» і «Жыве Беларусь!!!» зь непаўторным ангельска-швэдзкім акцэнтам! Агаломшаная публіка адказала самымі гучнымі за ўвесь вечар воплескамі. А групка дзяўчатак нават падхапілася скандаваць незалежніцкі покліч. Адразу пасьля гэтага апошні на гэты вечар напамін, што канцэрт адбыўся дзякуючы Адміністрацыі прэзыдэнта, быў ужо залішні — слухачы выказалі сваю думку адносна гэтага няўхвальным сьвістам.

*Аэрапорт Менск-1*

# ЗДАРОВА, ТАВАРЫШЫ, ДОЎГА ЧАКАЛІ!




«Майстар-клюб», вул.Будаўнікоў, 22.
(Маршруткай з маладачанскай прывакзальнай плошчы, прыпынак «Паліклініка».)

**19.00**

Квіткі: 10 тыс. Даведкі па т.: 6781899, 5023060, 6089586, 5062405.

# Народных шмат, любімы — адзін

Выйсьцем магло б быць заснаваньне паважнай ганаровай прэміі. Піша **Сяргей Харэўскі.**

Сам панятак «народны творца» — анахранізм, запазычаны з XIX стагодзьдзя. Нямецкія рамантыкі абсалютызавалі й ідэалізавалі свой народ. Адносіны творцы са сваёй нацыяй тады бачылася як складанае спалучэньне «Zeitgeist» (духу часу) і «Volksgeist» (духу народу), якому ён — як творца — абавязаны быў надаць форму. Варта тут адзначыць, што і ў Беларусі апэляцыі да «Думаў з Духу Нашага Народу» (Леў Вітан-Дубейкаўскі) былі тыповыя напрыканцы XIX — пачатку XX стагодзьдзя. Гэткім чынам творца, атаясамліваючы сябе з народам, цалкам шчыра імкнуўся быць «народным», нівэлюючы ўласную суб’ектнасьць: «То ня я пяю, край Божы даў мне ў сэрцы лад прыгожы...», «Я не паэта, крый мяне Божа...» і г.д. Натуральна, гэткімі паэтамі-народнікамі былі Багушэвіч, Лучына, Цётка, Купала.

Зьмест самога панятку «народ» набрыняў у XX стагодзьдзі іншым сэнсам і быў пастаўлены ў іншы кантэкст. Такім чынам «народны пісьменьнік» па вайне ператварыўся з выказьніка волі й думаў бальшыні (Народу) у яе лепшага прадстаўніка (Народу). А разам з тым мяжа паміж прафэсійнымі творцамі й нацыяй ператварылася ў бездань...

Быкаў і Навуменка, Барадулін і Брыль, Танк і Гілевіч — выдатныя творцы рознага маштабу і даробку. Між тым яны ўсе стаяць у адным шыхце Народных пісьменьнікаў. За савецкім часам гэта шмат значыла. Найперш у матэрыяльным сэнсе: лепшыя кватэры й летнікі, высокія ганарары й наклады.

Беларускім пісьменьнікам, як і мастакам і акторам, не хапіла духу ў 1991 годзе паставіць кропку ў гісторыі БССР. Яны не спынілі савецкае традыцыі раздачы дзяржаўных званьняў, зь якое самі ж і кпілі ў кулюарах. Напрыклад, скарачаючы званьне Заслужанага работніка культуры як «засраб». Пэўна ж, спадзяваліся дачакацца й сваёй чаргі.

Не хапіла духу і на тое, каб далучыць да свайго кола, напрыклад, Натальлю Арсеньневу. А якое б ёй маглі даць званьне?

У пачатку 1990-х у падобнай сытуацыі Адам Глёбус трапна заўважыў, што Народнымі можна называць толькі Коласа й Купалу, а вось любімы паэт нацыі адзін — Максім Багдановіч. Крыху не хапіла Караткевічу да гэткае ж безагляднае любові. А да Народнага не дажыў. Хоць акурат Караткевіч быў самым папулярным у публікі, што чытала без прымусу. На матывы ягоных твораў ставіліся тэатральныя пастаноўкі й здымаліся папулярныя кінафільмы. Ягонае імя ведалі, бадай, усе. Ён стаў легендаю пры жыцьці.

Калі ж браць пад увагу адно чытацкую папулярнасьць, то летась, напэўна, сярод чытацкай аўдыторыі самымі «народнымі» былі Ўэльбэк ці Зюскінд, а сёлета — які Муракамі й Бэгбэдэр.

Спроба інсьпіраваць выданьне беларускае «народнае кнігі» скончылася выхадам «Сьцяны» Васіля Быкава. Яе наклад быў блізу 1000 паасобнікаў. І гэта, пэўна, максымум для незалежнага грамадзтва.

Якія яшчэ могуць быць крытэры папулярнасьці? Хіба частата выкананьня паэзіі сьпяванай. Хоць бы і ў застольных гулянках. Калі браць пад увагу папулярнасьць літаратараў як песеньнікаў, то пэўна гэта Бураўкін зь Някляевым. Аднак пра аўтарства песень беларускія слухачы задумваюцца найменш. І злапаны на вуліцы выпадковы мінак не назаве аўтараў шлягераў. Пэўна ж, і аўтары цяпер гатовыя аджагнацца ад выканаўцаў зь сёньняшніх «Сяброў» ці «Верасоў». Эстрадная слава — скарацечная.

Калі ж браць за меру тое месца, што літаратар трывала займае ў мэдыйнай прасторы, то, вядома, самым папулярным («народным») будзе Адам Глёбус. Нават калі яго хто й не чытаў, то прынамсі ўжо пра яго начуты. Ён сам не стамляецца дбаць пра ўласны PR.

Разам з тым, з-за розных прычынаў, патэнцыйна папулярныя творцы не трапляюць у поле зроку шырокае публікі. Хоць і выдатна валодаюць багатым запасам сакавітых словаў і паводле формы сваёй паэзіі даступныя бальшыні. Гэта, напрыклад, такія выбітныя паэты, як Алег Мінкін і Славамір Адамовіч, чые зорныя шляхі ў літаратуру пачаліся яшчэ ў СССР. Але іх асобы аніяк не трапляюць у пракруставы ложак сёньняшніх рэаліяў у РБ...

Калі за адзін з крытэраў «беларускай народнасьці» творцаў узяць мову, то кола пытаньняў аўтаматычна рэзка звузіцца. Ня так цяжка будзе правесьці плебісцыт сярод часткі нашае нацыі, што чытае па-беларуску. Але застанецца пытаньне, навошта нам гэта высьвятляць? Каб шанаваць? Каб любіць? Каб выдаткаваць кватэру, кабінэт і грошы? Але гэта да вусьцішы падобна да савецкае практыкі.

Выйсьцем з савецкай культурнай прасторы ў новую культурную сытуацыю для пісьменьнікаў і мастакоў магло б быць заснаваньне паважнай ганаровай прэміі, кшталту Ганкураўскай у Францыі. Толькі адзін раз у адны рукі. «Залатая літара» і «Гліняны Вялес» — правобразы гэткае прэміі ў незалежным грамадзтве. Гэта насамрэч патрэбна нам усім, усёй нацыі. Рада даверу з кваліфікаваных экспэртаў і творцаў-практыкаў выбірала б лепшага. І той, лепшы, дзякуючы свайму таленту й прафэсіяналізму, станавіўся б неаспрэчным аўтарытэтам для ўсіх людзей паспалітых. Ягоныя творы ўяўлялі бы сабою сыстэму каардынатаў у нашым каламутным культурным затоне.

А пакуль адзінай аб’ектыўнай мераю папулярнасьці ў Беларусі можа стаць хіба толькі Інтэрнэт.

Але Глёбус меў рацыю: гэтак любіць іншага пісьменьніка, як любяць Багдановіча, ужо ніколі ня будуць...

# Сокал-Кутылоўскі без акуляраў

Перавыдадзеная кніга «Слуцкі збройны чын 1920 г. у дакумэнтах і ўспамінах».

У сёлетнім выданьні друкуюцца новыя дакумэнты, знойдзеныя ў архівах Варшавы, ды новыя ілюстрацыі.

Першае выданьне пабачыла сьвет у 2001 г. Тады над кнігай працавалі Уладзімер Ляхоўскі, Уладзімер Міхнюк і Аляксандра Гесь. Уладзімер Міхнюк заўчасна памёр два гады таму, і ў перавыданьні друкуецца вельмі цёплы артыкул калегаў у ягоную памяць.


**Цэшка афіцэра Беларускай вайсковай камісіі.**


**Слуцкі збройны чын 1920 г. у дакумэнтах і ўспамінах. —** Менск: Мэдысонт, 2006. — 400 с. — (Бібліятэка часопіса «Беларускі гістарычны агляд»). Цьвёрдая вокладка.

У прадмове ж да перавыдадзенай кнігі У.Ляхоўскі зазначае, што для гістарычных публікацыяў на тэму Слуцкага збройнага чыну характэрная перанасычанасьць эмацыйнымі ацэнкамі. І публікацыі апошніх гадоў не дадаюць нічога новага ў асэнсаваньні праблемы. Тым часам назапашаная фактальгічная база па антыбальшавіцкім супраціве на Случчыне дазваляе сёньня з аб’ектыўных пазыцыяў, без залішняй патэтыкі разглядзець і даць ацэнку падзеям.

Нагодай для перавыданьня сталі новыя дакумэнты, што былі знойдзеныя ў варшаўскіх архівах: вайсковым, у архіве Публічнай бібліятэкі. Таксама ў кнізе выкарыстаныя атрыманыя зь беларускіх пэрыёдыкаў зьвесткі, што ня трапілі ў першае выданьне.

Дадаліся і новыя ілюстрацыі. Сярод іх больш выразны і якасны фатаздымак Сяргея Бусла, які эміграваў пасьля ў Прагу. Мастак Віктар Ляхар адрэстаўраваў выяву паўстанцкай узнагароды, зацьверджанай Найвышэйшай радай, — крыж з выявай Пагоні аўтарства Лявона Вітан-Дубейкаўскага. У новым выданьні расшыфраваны даўні фатаздымак, на якім аднаго з трох слуцкіх ваяроў дасьледчыкі доўгі час пазначалі як Сокал-Кутылоўскага. «Насамрэч, чалавек у акулярах — гэта штабс-капітан Антон Борык», — цьвердзіць сп.Ляхоўскі. І дадае, што гэты міт далёка распаўсюдзіўся і нават увасоблены ў літаратуры: «У рамане Федарэнкі «Нічые» Сокал-Кутылоўскі не пазнае Чайку, бо забыўся на акуляры. Але ён ніколі ня меў праблемаў са зрокам».

Перавыдадзеная кніга мае шанец зрабіцца рарытэтам. Знайсьці «Слуцкі збройны чын 1920 г. у дакумэнтах і ўспамінах» можна ў «Акадэмкнізе», на выставе Ўправы Партыі БНФ, а таксама замовіць на сайце www.knihi.net.

**Сямён Печанко**



**Нягледзячы на абложныя дажджы, 25—26 жніўня адбыўся чарговы скульптурны пленэр «Легенда зь пяску». Аўтараў было не 12, як меркавалася, а каля 20. А залатых апосталаў у дзікіх заслаўскіх кар’ерах паўстала 12.**

# Я за ўсімі ўладамі сядзеў!

Доля беларуса. 27 жніўня — 100 гадоў з Дня нараджэньня **Сяргея Новіка-Пеюна.** Песьняра ўспамінае **Уладзімер Содаль.**

Сяргей Новік-Пяюн па натуры быў чалавек неспакойны, турботны, ні хвілінкі ня мог пасядзець на адным месцы. Ва ўсялякім разе мне ён такім запомніўся, калі я адведваў яго на ягонай менскай кватэры. Яму гэтак хацелася мне шмат чаго распавесьці, паказаць, і ён падхопліваўся з крэсла і бег шукаць то якіясь фатаздымкі, то дзёньнікавыя запісы. Мне гэта, безумоўна, усё было надзвычай цікава, але на гэты раз хацелася проста паслухаць ягоныя амплітудныя расповеды пра яго няпростае, зігзагава-маланкавае жыцьцё. Я папрасіў яго не мітусіцца, пасядзець са мною якую хвілінку ціха і распавесьці самыя цікавыя моманты зь ягонага жыцьця.

— Браток мой! — сказаў ён, прыпыніўшыся, — калі я распавяду табе пра самыя цікавыя моманты свайго жыцьця, зьбярэцца не на адну кнігу. Але табе дастаткова на першы раз толькі адно ведаць: от ты кажаш «сядзь, пасядзі»! А я ж, браток, за ўсімі ўладамі сядзеў. За палякамі сядзеў. За немцамі сядзеў. За саветамі сядзеў. То дазволь мне хоць трохі пахадзіць!» — згарэзіў ён і згадаў такія старонкі з свайго жыцьця, што і напраўду тых аповедаў яго хапіла б не на адну кнігу.

Сьцісла, але на густым замесе пададзены ў бібліяграфічным слоўніку «Беларускія пісьменьнікі» аўтабіяграфічныя зьвесткі пра яго. То пакарыстаюся паслугаю згаданага даведніка (T.V. С. 397—398).

«Новік-Пяюн Сяргей... нарадз. 14/27/8.1906, в.Лявонавічы. Зь сялянскай сям'і. С.Новік-Пяюн вучыўся ў Нясьвіскай рускай гімназіі (1918—24), на беларускіх настаўніцкіх мэтадычна-пэдагагічных курсах у Вільні (1925—26), дзе атрымаў званьне беларускага настаўніка. У 1926 стварыў у роднай вёсцы Лявонавічы беларускі народны хор і беларускі народны тэатар, якімі кіраваў сам. Арганізаваў гурток ТБШ, беларускую бібліятэку і тайныя школы ў Лявонавічах і суседніх вёсках, за што быў высланы польскімі ўладамі ў г.Сьвеце над Віслай, дзе прабыў амаль 5 гадоў (1926—31). Вярнуўшыся адтуль, у хуткім часе зноў быў арыштаваны і высланы пад нагляд паліцыі ў Слонім. У 1939 польскай паліцыяй адпраўлены ў турму г.Баранавічы, адкуль вызвалены Чырвонай Арміяй у час паходу ў Зах.Беларусь. ...У чэрвені 1941 у час нямецкага бамбаваньня быў паранены. Разам з заснавальнікам музэю археолягам І.Стаброўскім вынес музэйныя экспанаты на ўскраіну гораду і схаваў у падвале. ...Забясьпечваў партызан паперай для ўлётак, мэдыкамэнтамі, распаўсюджваў улёткі Саўінфармбюро. У 1943 арыштаваны слонімскім СД і засуджаны да пакараньня сьмерцю. ...У час расстрэлу быў паранены, прыкінуўшыся мёртвым, і гэта выратавала яго. 12 ліпеня 1944 разам з партызанамі прыйшоў у разбураны Слонім. Працаваў дырэктарам Слонімскага краязнаўчага музэю. 14 сьнежня 1944 па ілжывым даносе арыштаваны і зьняволены ў турму. 24 сакавіка 1945 ваенны трыбунал засудзіў яго да 10 гадоў пазбаўленьня волі і адправіў на Калыму. У 1945—58 у Якуціі рэабілітаваны. У 1959 вярнуўся на Беларусь. Жыў у Слоніме, Нясьвіжы, з 1960 — у Менску».



Сяргей Новік-Пяюн арганізаваў гурток ТБШ, беларускую бібліятэку і тайныя школы ў Лявонавічах і суседніх вёсках, за што быў высланы польскімі ўладамі ў г.Сьвеце над Віслай, дзе прабыў 5 гадоў.

Як бачым, Сяргей Новік-Пяюн прайшоў праз усе выпрабаваньні. Выжыў, выдужаў. І выдужаць яму дапамагла глыбокая вера ў свой народ, у моц роднага слова. Менавіта за глыбокую веру ў сваё роднае слова ён прыняў столькі пакутаў. Яго даўно трэба было залічыць да ўсіх сьвятых Беларусі.

Любіў дзяцей. У Заходняй Беларусі выдаваў для іх часопіс «Заранка», а на сваёй менскай кватэры стварыў зь дзецьмі патрыятычны клюб. Невыпадкова адзін зь ягоных псэўданімаў

ЗОРАЧКІ

Словы і музыка Сяргея Новіка-Пеюна

*Прысьвячаю маім Бацькам*

Дні прыходзяць, дні адходзяць, дні лятуць,
Быццам рэк бурлівых хвалі ўдаль плывуць.
Трэці год, як на выгнаньні ў чужыне
Трэба мучыцца душой і сэрцам мне.

Навакол нідзе ня ўгледзіш родных хат,
Не працягне рук зычліва родны брат,
Не падзеліш нават думак зь нікім тут,
Не прыгорне ў адзіноцтве родны кут.

Ўночы зорачкі прыветліва мігцяць,
Быццам зь неба на мяне яны глядзяць...
Што чуваць, скажэце, зорачкі, вы мне,
У маёй роднай — ды далёкай старане?

Ці татулька мой і матанька ўжо сьпяць?
Ці таксама на іх зорачкі глядзяць?..
Мо й яны пытаюць зорак аба мне,
Што раблю цяпер у далёкай чужыне? —

Калі толькі яны, родныя, ня сьпяць,
Калі йшчэ цяпер на зорачкі глядзяць
Занясеце ім, пакуль ня бліснуў сьвет,
Зоркі мілыя, сыноўскі мой прывет!

І скажэце. Каб ня плакаў ні адзін,
Што ў выгнаньні мусіць мучыцца іх сын!
Прыйдзе, прыйдзе да нас хутка ясны май,
Прыляту тады, як птушка, ў родны край.

З новай верай, з новай сілай зажывём
Беларускі гімн свой родны запяём
Беларускай песьні роднае пад тон
Зааром мы і засеем свой загон.

Ўночы будзем мы на зоркі паглядаць,
Што, як сёньня, будуць у небе зіхатаць...
Занясеце ж вы, пакуль ня бліснуў сьвет,
Зоркі мілыя, бацькам маім прывет!

*Сьвеце над Віслай*
*29 сакавіка 1929*




## Паштоўка з высылкі

**Пісаная і маляваная Сяргеем Новікам-Пеюном. Паэт адказваў на запрашэньне сяброў Беларускага студэнцкага саюзу, якія хацелі бачыць яго на дзесяцігодзьдзі гэтай кузьні інтэлектуальных кадраў Заходняй Беларусі. «Прыбыць асабіста» Пяюн ня мог, бо якраз тады быў у высылцы ў Сьвеце. Там былі напісаныя і «Зорачкі».**

быў Малады Дзядок. Ведаў не адну мову. Сярод іх эспэранта. На ўсіх гэтых мовах ён пісаў.

Першы раз я напаткаў Сяргея Новіка-Пеюна на ягонай менскай кватэры 19 кастрычніка 1978 году. Прыгадваецца: адзіны пакой там быў увесь у фатаздымках, партрэтах, малюнках. Гэта былі пераважна партрэты беларускіх дзеячаў: Скарыны, Каліноўскага, фатаздымкі сяброў і паплечнікаў: Міхася Забэйды, Рыгора Шырмы, Максіма Танка... За шырмай, пры ложку, фатаздымкі родных і блізкіх: матулі, бацькоў, сястры...

Апошнім часам Сяргей Новік-Пяюн жыў адзін, і часта яго маўклівымі субяседнікамі былі постаці, адбітыя на гэтых партрэтах. Пра кожнага зь іх ён мог распавядаць доўга і цікава. Зрокава памятаю: у адным нататніку чырвоным атрамантам былі запісы пра Самойлу. Я хацеў іх ці чытаць, ці займець копію. Ці то гэта адклалі на потым. Але гэтага «потым» чамусь не было, на жаль...

Хай жа ўрокі мужнасьці Сяргея Новіка, які стаўся Пеюном, будуць для нас усіх узорам адданасьці.






АНДРЭЙ ЛЯНКЕВІЧ

**«Зорачкі» зноў набылі папулярнасьць, дзякуючы прачуламу выкананьню Аляксандра Памідорава.**




# У пошуках скрыпкі Агінскага

**Music of the Oginsky Dynasty. —** «Каўчэг», 2006.

**Музычная спадчына Агінскіх, Асташэўскіх і Залускіх, выдадзеная дбаньнямі Івы Залускага, нашчадка Міхала Клеафаса Агінскага.**




Напачатку палянэз Агінскага гучаў зусім іначай, унук князя Міхала Клеафаса адшукаў Трою, іншы нашчадак адкрываў Эўропе джаз... Якія яшчэ загадкі тоіць кампазытарская дынастыя Агінскіх? Зь Віктарам Скарабагатавым гутарыць **Зьміцер Падбярэскі.**

**«Наша Ніва»: Ці ўся музыка, напісаная Агінскімі, адшуканая?**

**Віктар Скорабагатаў:** Літаральна гадоў восем-дзесяць таму было даказана, што мэлёдыя «Ешчэ Польска не згінэла», то бок мазурка Дамброўскага, сучасны гімн Польшчы, напісаная Міхалам Клеафасам Агінскім. Яго нашчадак Анджэй Залускі знайшоў рукапіс твору, аўтограф. Таму гэтыя дыскі з спадчынай Агінскіх — толькі пачатак «раскопак». Ніхто ж дакладна ня можа сказаць, што бачыў і расчытаў усе рукапісы, якія зьберагаюцца, скажам, у маскоўскім архіве Агінскага. Уладзімер Шчасны дамогся атрымаць хаця б копіі дакумэнтаў. Але ж у Маскве ноты, напісаныя рукой Міхала Клеафаса, маюцца ня толькі ў дзяржаўным, але і ў нотным кансэрваторскім архіве. У прыватнасьці, скрыпічныя творы. Мы ведаем Міхала Клеафаса як кампазытара, які пісаў для фортэпіяна, але ж улюбёным ягоным інструмэнтам была скрыпка. Дык што, няўжо ж ён нічога для скрыпкі не напісаў?! Трэба проста шукаць, шукаць іх даўнюю маёмасьць ад Варшавы да Масквы. Ёсьць не да канца разабраныя архівы кляштараў, храмавыя, дзяржаўныя, гарадзкія архівы. Пошукавую працу трэба працягваць.

**«НН»: Для князёў Агінскіх кампазытарства было хобі ці ўсё ж родам прафэсійнай дзейнасьці?**

**ВС:** Правяду паралель з Антоніем Радзівілам. Ён быў сваяком прускага караля, дванаццатым ардынатам Нясьвіжу, адным з найбольш заможных на той час людзей у сьвеце, палітыкам... І ў той жа час Гётэ пра яго гэтак напісаў у сваім дзёньніку: «Геніяльная, парывістая кампазыцыя князя да «Фаўста»!» Геніяльная кампазыцыя! Гэтак выказаўся чалавек, які сябраваў з Бэтговэнам, да якога з пашанай зьвяртаўся Бэрліёз, які сам быў дырэктарам ці ня опэрнага тэатру. Дык хто ж тады Антоні Радзівіл? І хто такі Міхал Клеафас Агінскі? Ну, скажам, першы ў сьвеце міністар адукацыі. Паводле Канстытуцыі, 3 траўня 1793 году ў Рэчы Паспалітай было ўтворана такое міністэрства, і першым ягоным міністрам быў менавіта ён. Такім чынам — міністар? Палкаводзец? Кампазытар? І тое, і другое, і трэцяе. Проста гэта былі такія маштабныя постаці, асобы рэнэсанснага тыпу, якія маглі выявіць сябе яскрава і таленавіта ў самых розных галінах жыцьця, літаральна ва ўсім, да чаго дакраналіся.

**«НН»: А хто з нашчадкаў Міхала Клеафаса можа спрачацца зь ім у славе?**

**ВС:** Бясспрэчна, яго унук Караль Бэрнард Залускі. Дастаткова паглядзець на ноты ягонага палянэзу. Гэта напісана па-мастацку проста калясальна! Караль Бэрнард быў вайскоўцам, дыпляматам, актыўна займаўся навукай, у прыватнасьці, разам са Шліманам раскопваў Трою, першы расшыфраваў старажытнагрэцкія мэлёдыі і рытмы. І гэта відаць у яго фортэпіянных творах, якія пазначаны надзвычай складанай рытма-

арганізацыяй. Ён сяброваў зь Лістам. З нотаў відаць, што ён пісаў не для шараговых выканаўцаў, а для віртуозаў.

**«НН»: Як выглядаюць Агінскія на фоне іншых знакамітых кампазытарскіх дынастыяў?**

**ВС:** Бахаўская дынастыя — найбольш вядомая ў сьвеце. Пры жыцьці Ёган Сабастыян Бах быў большменш вядомы як музыка, але яго хутчэй прымалі як арганіста, чым як кампазытара: выдавецкая справа толькі разгортвалася, ягоныя творы амаль не друкаваліся. Нават пасьля яго сьмерці калі і ўжываўся выраз «вялікі кампазытар Бах», дык меўся на ўвазе ягоны старэйшы сын Карл Філіп Эмануіл. Дарэчы, Вольфганг Моцарт вучыўся і ў Карла Філіпа Эмануіла, і ў Ёгана Хрысьціяна, сыноў Ёгана Сабастыяна.

Але Агінскія — дык гэта сапраўды фэнамэнальны вынік, хаця б па часе. Кампазытар Караль Агінскі нам вядомы яшчэ з часу Баха. І да сёньня гэтая дынастыя мае кампазытараў, адпаведных стылю той эпохі, у якой жывуць і працуюць. Напрыклад, Войцех Астоя-Асташэўскі. Ён быў кампазытарам хутчэй джазавым, чым акадэмічным. У 30-я гады XX ст. у Эўропе з джазам толькі-толькі пачыналі знаёміцца. І адзін з нашчадкаў Агінскіх, якіх мы ведаем як кампазытараў-клясыкаў, спрычыніўся да папулярызацыі джазу. Дый сам Іва Залускі, і яго брат трымаюцца ў творчасьці клясычных кірункаў, хоць і не без экспэрымэнтаў. Іва Залускі нават напісаў фортэпіянны твор для левай рукі. Хоць першым тут быў Равэль, які напісаў канцэрт для фортэпіяна з аркестрам для левай рукі: ягоны сябра-піяніст падчас вайны страціў правую руку.

**«НН»: Але ці можна казаць пра тое, што Іва Залускі выступае ня толькі як прафэсійны кампазытар, але і як прафэсійны піяніст?**

**ВС:** Чым больш людзей выканалі тую ці іншую п’есу, тым больш варыянтаў яе прачытаньня. Мы ўсе нібыта выдатна ведаем ля-мінорны палянэз Міхала Клеафаса Агінскага «Разьвітаньне з Радзімай». Але нам гэта толькі здаецца. Па сутнасьці, Іва Залускі адкрыў нам гэты твор, бо адшукаў ня проста запісаны тэкст п’есы рукой Агінскага. Ён знайшоў яшчэ й першыя выданьні палянэзу, якія выходзілі пры жыцьці Агінскага ды яшчэ пры ягоным удзеле. Паміж рукапісам і выданьнем маюцца адрозьненьні ў нотным тэксьце. Вось Ігар Алоўнікаў і выконвае часта гэты твор на канцэртах, і запісаў яго. Маецца цяпер і запіс Івы Залускага. Канечне ж, параўноўваць іх як піяністаў немагчыма: Іва на фоне Ігара выглядае як аматар. Тым ня менш, яны ж выконваюць розныя рэдакцыі аднаго й таго ж твору. І тая, і другая рэдакцыі былі напісаныя ды выдадзеныя пры жыцьці Агінскага, таму і атрымліваецца, што абедзьве рэдакцыі маюць права на выкананьне. Гэта — аўтарскі тэкст. А дагэтуль мы ведалі, на жаль, толькі рэдакцыю Рагаль-Лявіцкага, паводле якой і была зроблена сымфанічная партытура. І вось яна наагул адрозьніваецца ад аўтарскай рэдакцыі!

**Віктар Скарабагатаў падчас рэпэтыцыі.**


АНДРЭЙ ЛЯНКЕВІЧ

ПРАЕКТ ГІСТАРЫЧНАЙ МУЗЫКІ «СТАРАЖЫТНАЯ ЗЯМЛЯ»



КЗ «Менск», Кастрычніцкая, 5 8 верасьня, 19.00

# Гістарычная песьня

## Кудмень, Тэстамэнт, Рокаш, Тутэйшая шляхта Стары Ольса, P.L.A.N.

Архаічныя мужчынскія сьпевы, гістарычныя песьні XIV—XIX ст., песьні на словы Яна Чачота, стылізацыі і аўтарскія кампазыцыі на гістарычныя тэмы. Кошт квіткоў 10 000 — 16 000.
Тэл. для даведак: 2066638 (каса), 029−5736746, 029−6168490

**Кудмень**

У кожнага народу ёсьць свая традыцыя мужчынскага выкананьня гістарычнай песьні. «Кудмень» аднаўляе традыцыю мужчынскіх палескіх сьпеваў. Самі падарожнічаюць, вучацца беспасярэдне ад захавальнікаў традыцыі. Кіраўнік — Ірына Мазюк, супрацоўніца Інстытуту праблемаў культуры.
На канцэрце выконваюцца 3 старажытныя баляды і адна рэкруцкая песьня.

**Стары Ольса**

Самы папулярны гурт сярэднявечнай музыкі ў Беларусі. Апошні альбом гурту «Гераічны эпас» прэзэнтуе беларускія рэканструкцыі гераічных песень XIV—XVII ст. Песьні рэканструяваныя на аснове летапісаў і народных балядаў. Беларускія архаічныя інструмэнты: гусьлі, дуды, лютня, цыстра, жалейкі і г.д. Кіраўнік — Зьміцер Сасноўскі.

**Тэстамэнт**

Пераможца II Конкурсу маладых выканаўцаў старадаўняй музыкі («Наваградак−2006»). Адметнасьць гурту — выкананьне беларускіх песень і балядаў XVII ст. Зь вядомага фальклёрнага — збор Л.Федароўскага. Кіраўнік — пераможца Конкурсу маладых дудароў — 2006 Юрась Панкевіч.

**Тутэйшая шляхта**

Асноўныя ўдзельнікі — гэта выкладнікі і студэнты БДУ. Яны выканаюць аўтарскія песьні Лявона Махнача на словы Яна Чачота.

**Рокаш**

Пераможца Конкурсу маладых выканаўцаў старадаўняй музыкі — 2005. Адзначаны адмысловым прызам Нацыянальнага радыё. У гурт уваходзяць маладыя людзі — удзельнікі рыцарскага беларускага руху. Таксама музыкі займаюцца музычнымі гістарычнымі стылізацыямі.

**P.L.A.N.**

Гэты сучасны гурт прэзэнтуе праграму, прысьвечаную беларускай гісторыі: стылізаваныя аўтарскія кампазыцыі з жывым гукам на народных інструмэнтах.

# Аршанская бітва




Фэст беларускай аўтарскай песьні й паэзіі «Аршанская бітва — 2006» адбудзецца сёлета **9 верасьня**. Пачатак а 19–й.

Фэст адбываецца на месцы Аршанскае бітвы 1514 г. — правым беразе Дняпра, дзе ў яго ўліваецца рэчка Крапівенка. Ён доўжыцца ўсю ноч, каб за нядзелю ўдзельнікі змаглі адпачыць і спакойна дабрацца дадому. Фэст праходзіць на адкрытым паветры ля ракі, варта падумаць пра цёплую вопратку, ежу і намёт. Дровы для вогнішча будуць на месцы.

### Даезд

З чыгуначнага вакзалу на аўтобусе ці маршрутцы №11 да аўтавакзалу (канцавы). Далей — аўтобусам «Ворша—Дуброўна» да прыпынку «Гацькаўшчына». Гуртам можна наняць маршрутку з вакзалу проста да Гацькаўшчыны.

Таксама аўтобусам або маршруткай можна ад’ехаць ад прывакзальнае плошчы да прыпынку «Цэнтар», затым ад Цэнтральнай плошчы, што ля Дому гандлю (прыпынак за помнікам Леніну), сесьці на аўтобус ці маршрутку «Ворша—Дуброўна» і ехаць да прыпынку «Гацькаўшчына». Адтуль да месца фэсту 1 км.

**Ахвотныя дапамагчы** могуць тэлефанаваць: 319-65-74 (Генадзь).

**Дадатковая інфармацыя**: 291-62-38 (Юрка).

### Спадарожныя цікавосткі

Абапал Цэнтральнай плошчы Воршы — музэй Уладзімера Караткевіча і Прыдняпроўскі парк з помнікам на месцы яго хаты.

У парафіяльным касьцёле Сьв.Язэпа (вул.Савецкая) захоўваецца копія карціны XVI ст. «Аршанская бітва»; да касьцёлу ад прывакзальнае плошчы можна даехаць маршрутам №1 (прып. «Швейная фабрыка»).




**Чытайце ў Сеціве пра фэст:** http://radzima.org/pub/miesta.php?miesta_id1=viarvors.

**Мапы:** http://orshacity.narod.ru/map/orshamap/index2.html; http://www.emaps-online.com/rus_win/maps/oblast/obl_vitebsk/regions/reg_orsha/cities/orsha/map.shtml.

## ВАРТА ПАГЛЯДЗЕЦЬ

### Субота, 2 верасьня

**НТВ, 14.00**

«Паласаты рэйс».

Расея (СССР), 1961, рэж. Уладзімер Фецін.

Камэдыя.

Залаты фонд савецкай кінакамэдыі. У галоўнай ролі — Яўген Лявонаў.

**АНТ, 14.20**

«Восеньскі маратон».

Расея, 1979, рэж. Георгі Данэлія.

Лірычная трагікамэдыя.

Датклівая, цёплая і чалавечная кінастужка.

**БТ, 14.30**

«Маем рэчы».

Беларусь, 2006, аўтар і вядоўца — Алесь Матафонаў.

Тэма перадачы — ручнікі.

**БТ, 16.45**

«Захавай мяне, мой талісман».

Украіна (СССР), 1986, рэж. Раман Балаян.

Мэлядрама.

Ролі выконваюць: Алег Янкоўскі, Тацяна Друбіч, Аляксандар Абдулаў.

**СТВ, 20.15**

«Гаспадар мораў: на ўскраіне Зямлі».

ЗША, 2003, рэж. Пітэр Ўір.

Прыгодніцкая драма паводле раманаў Патрыка О'Браяна.

2 прэміі «Оскар», 3 намінацыі на «Залаты глёбус», 4 прэміі Брытанскай кінаакадэміі.

**БТ, 21.35**

«Як забіць суседзкага сабаку».

Нямеччына—ЗША, 2000, рэж. Майкл Калесьніка.

Камэдыйная мэлядрама.

У драматурга Пітэра — крызіс. Яго раздражняе ўсё, нават гаўканьне суседзкага сабакі...

У галоўнай ролі — Кенэт Брана.

Фільм мае шэраг узнагародаў на міжнародных фэстах.

**СТВ, 00.15**

«Пяць перашкодаў».

Данія—Швайцарыя—Бэльгія—Францыя, 2003, рэж. Ёрген Лет, Ларс фон Трыер.

Экспэрымэнтальны дакумэнтальны фільм.

У 1967 годзе Ёрген Лет зрабіў дакумэнтальную стужку, якая вельмі падабаецца Ларсу Трыеру. У 2000 годзе Трыер прапанаваў Лету паўтарыць стужку — пяць разоў з новымі ўмовамі.

**БТ, 00.15**

«Няма вестак ад Бога».

Гішпанія—Францыя—Італія—Мэксыка, 2001, рэж. Агустын Дыяз Яньез.

Містычная камэдыя.

Дасьціпная містычная камэдыя, якая заслужыла 11 намінацый на гішпанскую прэмію «Гоя».

Ролі выконваюць зоркі: Вікторыя Абрыль, Пэнэлопа Круз, Фані Ардан.

### Нядзеля, 3 верасьня

**«Лад», 10.15**

«Мёд асы».

Беларусь, 1991, рэж.Ігар Волчак.

Лірычная драма.

Успаміны героя пра пасьляваеннае дзяцінства. Адзіны іграві фільм выбітнага аніматара Ігара Волчака.

**БТ, 16.20**

«Час кіно».

Беларусь, 2006, вядоўца — Ігар Сукманаў.

Першая частка перадачы пра сёлетні Канскі фэст.

**СТВ, 20.25**

«Капітан».

Францыя—Італія, 1960, рэж. Андрэ Юнэбэль.

Прыгоды.

У галоўнай ролі — Жан Марэ.

**«Лад», 17.55**

«Дзікае паляваньне караля Стаха».

Беларусь, 1979, рэж. Валер Рубінчык.

Гісторыка-філязофскі дэтэктыў паводле аднайменнага раману Ўладзімера Караткевіча.

Адзін з найлепшых фільмаў беларускага кіно.

**АНТ, 21.05**

«Аляксандар».

ЗША, 2004, рэж. Олівэр Стоўн.

Гісторыка-біяграфічны фільм.

Фрэйдыская біяграфія першага глябаліста — Аляксандра Македонскага, пастаўленая амэрыканскім леваком.

Ролі выконваюць: Колін Фарэл, Анджэліна Джолі, Энтані Гопкінз.

**БТ, 22.20**

«Пакой сына».

Францыя—Італія, 2001, рэж. Нані Марэці.

Сямейная псыхалягічная драма.

Сьмерць сына разбурае сям'ю Сэрмонці…

Залатая галіна Канскага кінафэсту.

**Андрэй Расінскі**

## КІНО НА DVD

**MASTER RECORDS**

**КЛЕРКІ-2** (Clerks 2).

Камэдыя, ЗША, 2006, рэж. **Кевін Сьміт.**

У ролях: **Браян О'Хэларан, Джэф Андэрсан, Разарыя Доўсан.**

Абібокі Дантэ і Рэндал працуюць у закусачнай у кампаніі прыдуркаватага Элайса і сэксапільнай Бэкі… З-за сакавітай брутальнай лексыкі прагляд карціны толькі з 16 гадоў.

**Менск, Кісялёва 12, 643-21-08**



ЮЛІЯ ДАРАШКЕВІЧ

# Саколкі гатовыя: чорныя і белыя

Чытачы «НН» вырабілі майкі (цішоткі) да стагодзьдзя газэты.

Замовы прымаюцца на e-mail: zamova2006@tut.by і тэл. (029) 649-08-88. Пазначаць трэба імя, кантакт (мэйл ці тэлефон), колькасьць і памер.

**На фота: канцэрт «Песьні Свабоды» 25 жніўня.**



## ФЭСТЫВАЛЬ

### Томас Андэрс і маскоўскія камікадзэ ў Мірскім замку

1 верасьня на прыступках Мірскага замку пройдзе фэстываль «Ноч агню ў Мірскім замку». Чакаюцца піратэхнічныя эфэкты і фаервэркі ад камандаў зь Беларусі, Украіны, Чэхіі, Малдовы, Расеі, у тым ліку маскоўскага «Камікадзэ-шоў».

Фінальным акордам «Музычных вечароў» стане паўтарагадзінны канцэрт саліста легендарнага гурту *Modern Talking* Томаса Андэрса, які ў суправаджэньні музыкантаў а 15.00 правядзе sound-check, а ўжо вечарам пад зорным небам гледачы пачуюць новыя песьні, вядомыя гіты *Modern Talking* і рамантычныя баляды.

Напэўна, пасьля гэтага канцэрту архітэктурны дыямэнт Беларусі стане месцам пакланеньня для фэнаў салодкай заходняй папсы. Трэ будзе пільна сачыць, каб ня пэцкалі муры крэйдавымі сэрцайкамі і ружачкамі.

## ФУТБОЛ

### Беларусь—Альбанія

2 верасьня (субота). Адборачны матч Чэмпіянату Эўропы — 2008 паміж нацыянальнымі зборнымі Беларусі і Альбаніі. Менск. Стадыён «Дынама». Пачатак а 20-й. Квіткі: 2 000—10 000. Перад футболам — канцэрт зорак беларускай эстрады.

## ВЫСТАВЫ

### Леанід Шчамялёў

У мастацкай галерэі твораў Л.Шчамялёва (пр. Ракасоўскага, 49) да 9 верасьня працуе выстава жывапісу Леаніда Шчамялёва.

### Кніжная графіка

У Музэі сучаснага выяўленчага мастацтва (пр. Незалежнасьці, 47) працуе выстава кніжнай графікі Васо Псаракі.

## КІНО НА ВЫХОДНЫЯ

# Праклікanae жыцьцё

**Клік: з пультам па жыцьці** (Click).
ЗША, 2006, каляровы, 98 хв.
**Жанр:** камэдыя.
**Адзнака:** 6 (з 10).

Фільм «Клік» прымушае плакаць над кінапашляком Эдэмам Сэндлерам, кусаць локці ад таго, што сюжэт не дастаўся Тыму Бёртану і... выклікае жаданьне памяняць уласнае жыцьцё.

Працаголік Майкл набывае адмысловы пульт. Пульт дазваляе адключыць гук у хатняга сабачкі, Паставіць на паўзу кіраўніка і пракруціць усё няважнае на паскоранай хуткасьці. Але няважнай становіцца сям'я, ціхія чалавечыя радасьці й любоў. Майкл спрабуе пазбавіцца ад азьвярэлага падарунку, але пульт упохапкі гоніць яго да сьмерці.

Фільм Фрэнка Карачы спачатку падаецца звыклай тупой камэдыяй. Але ўрэшце камэдыя аказваецца казкай з хэпі-эндам.

Варта глядзець тым, хто думае пра тое, як бы ўласнае жыцьцё не «праклікаць».

**Андрэй Расінскі**




## НАШЫ ШАШКІ

# Што ў Драгічыне

«Адкрыты чэмпіянат Берасьцейшчыны па рускіх шашках» — гучыць добра, «Шашачны фэстываль «Етвызь-2006» — гучыць яшчэ лепш. Ад пачатку 1990-х у гарадку на паўдарозе між Кобрынам і Пінскам штогод ладзяцца фэсты па клясычных шашках-64 ды бліцы. На іх завітваюць не адно землякі-палешукі, а і гульцы з Масквы ды Сібіры. Дзякуючы міжнароднаму майстру Васілю Нагурнаму, намесьніку дырэктара адной з драгічынскіх прафтэхвучэльняў, пры раньнім Лукашэнку гульні набылі афіцыйны статус. Аднак захаваўся і рамантычны назоў эпохі «адраджэнца яцьвягаў» Міколы Шаляговіча.

Сёлета ў галоўным турніры рэй вялі варагі, менскія майстры Вячаслаў Палянскі і Юры Файнберг. Трэцяе месца ўзяў драгічынец Зьміцер Гарматны. Для яго «бронза» — немалы посьпех: кандыдат у майстры абышоў шэраг майстроў, у тым ліку чэмпіёна Беларусі. Апошні выступіў слабавата (50%): як прызнаецца сам Яўген Кандрачэнка, галава яго занята выдавецкімі праектамі. Дарэчы, сп.Нагурны, экс-чэмпіён краіны ў гульні празь ліставаньне, які выхаваў плеяду палескіх разраднікаў, вядомы тым, што выдае адзіны ў Беларусі шашачны часопіс. Хоць і ня дужа рэгулярна: апошні, 4-ты, нумар зьявіўся два гады таму.

**ВР**

**Ваш ход**

В.Палянскі—Ю.Файнберг, 55-ты чэмпіянат Беларусі. Чорныя пачынаюць і выйграюць.



**Адказ:** 1...hg3! 2. fg5 hf4 3. eg5 ce3 4. hf4 ef6 5. ge7 eg5X. На 2. fe5 Файнберг згуляў бы 2...ef6! 3. hf4 ba5 4. db6 fb2 5. ab4 ac3 6. ca3 bc7 7. db4 cc3X.

# Каб штотыдзень атрымліваць газэту, дасылайце адрасы і прыватныя ахвяраваньні

Каб гарантавана чытаць «Нашу Ніву» цяпер, калі «Саюздрукам» і «Белпошце» забаронена распаўсюджваць газэту:

1) Просім усіх ахвотных чытаць газэту **паведамляць у Рэдакцыю свае адрасы і тэлефоны. Гэта можна зрабіць па тэлефоне, факсам, праз пошту ці электронную пошту.** Тэлефоны: (017) 284-73-29, (029) 260-78-32 (МТС), (029) 618-54-84, e-mail: dastauka@tut.by, паштовы адрас: а/с 537, 220050 Менск.

2) Просім кожную сям'ю чытачоў **пералічваць на рахунак** газэты ахвяраваньне з разьліку 6 000 рублёў на месяц. Гэтага будзе досыць для выхаду і дастаўкі газэты. **У блянку банкаўскага паведамленьня ці паштовага пераказу, калі ласка, дакладна**
**і разборліва пазначайце ваш адрас, у тым ліку паштовы індэкс і код пад'езду.** Тыя, хто перакажа 18 000 рублёў за раз, забясьпечаць выхад газэты на тры месяцы. Хто ж мае магчымасьць пераказаць 36 000 рублёў адразу,

# Шчыры дзякуй за ахвяраваньні

**Анатолю В., В.К., В.П., Алене Л., А.В., Андрэю Ш., Галіне В., А.Л., Леанiду А., Івану Я., Адаму З., Сяргею Ш., Ірыне В., Віктару В.** зь Менску.
**К.Т.** з Радашкавічаў.
**Аляксандру Б., Алене К., Тацяне Р.** з Горадні.
**С.Ц.** зь Лепельскага раёну.
**Міхасю Т.** са Слуцку.
**Гелене Б.** з Воранаўскага раёну.
**Паўлу Л.** з Глыбокага.
**Аляксандру А.** з Полацку.
**Паўлу Ж.** зь Віцебску.
**В.П.** з Магілёва.
**Эдмунду А.** з Шаркаўшчыны.

Дыяна Леанідаўна зь Менску, паведаміце, калі ласка, нумар сваёй кватэры.
Сяргей Рыгоравіч Н., паведаміце, калі ласка, свой адрас.
М.В.Е. з вуліцы 17 верасьня, удакладніце адрас.
С.В.А. з Радашкавічаў, дашліце дакладны адрас.

0402280179
**ИЗВЕЩЕНИЕ**

**Фонд выданьня газэты «Наша Ніва», УНП 101 115 521**
получатель платежа
**МГД ААТ «Белінвестбанк», вул.Калектарная, 11, Мінск, код 764**
наименование банка

Счет получателя: **3015 212 000 012** Лицевой счет:

(фамилия, имя, отчество, адрес)

| Вид платежа | | | Дата | Сумма |
|---|---|---|---|---|
| Ахвяраваньне | | | | |
| | | | Пеня | |
| | | | Всего | |

Кассир Плательщик

**Фонд выданьня газэты «Наша Ніва», УНП 101 115 521**
получатель платежа
**МГД ААТ «Белінвестбанк», вул.Калектарная, 11, Мінск, код 764**
наименование банка

Счет получателя: **3015 212 000 012** Лицевой счет:

(фамилия, имя, отчество, адрес)

**КВИТАНЦИЯ**

| Вид платежа | | | Дата | Сумма |
|---|---|---|---|---|
| Ахвяраваньне | | | | |
| | | | Пеня | |
| | | | Всего | |

Кассир М.П. Плательщик

## На які рахунак пералічаць грошы?

Ахвяраваньне можна перавесьці ў любым аддзяленьні банку, на любой пошце. Улічыце, што пры пераказваньні грошай паштовым пераводам пошта спаганяе дадаткова 3%, а пры пераводзе грошай праз «Беларусбанк» працэнту не бяруць.
На банкаўскай квітанцыі ў графе «Від плацяжа» трэба пазначыць: «Ахвяраваньне». У графе: «Атрымальнік плацяжа» трэба пісаць: «Фонд выданьня газэты «Наша Ніва», УНП 101 115 521». У графе «Найменаваньне банку» трэба пісаць: «МГД ААТ «Белінвестбанк», вул.Калектарная, 11, Мінск, код 764». У графе «Рахунак атрымальніка» 3015 212 000 012. Пры перасылцы грошай па пошце тое самае трэба пісаць у рубрыках «Каму» і «Куды».

# калі б...

**...вэрсія аб тым, што партрэт Скарыны ў новых падручніках малявалі зь Яго, была праўдзівая.**

— ...А што, амаль падобны. Цяпер трошкі патусуюся ў Санкт-Пецярбургу, і няхай пасьля гэтага нехта скажа, што Бацька брахаў, калі казаў, што Скарына жыў і працаваў у Піцеры.





**...дажджы не прыпыняліся.**

— ...затое цяпер пабачым Эўропу. Нам жа ж забаронена ўяжджаць, а не ўплываць.

МАЛЮНКІ І ТЭКСТЫ ЛЁЛІКА УШКІНА



## У НУМАРЫ

### Казацкі выбар Юшчанкі



Януковіч адбудоўвае горад Мазепы, а Юшчанка прапагандуе нацыянальную культуру. **Старонка 18.**

### Вітаўт Мілінкевіч



выгнаны з польскага інтэрнату. Камэнтар Аляксандра Мілінкевіча — **старонка 14.**

# ВЕРШАВАНАЯ АЗБУКА

**Кастуся Севярынца і Сьвятланы Баранкоўскай**

Лета коціцца з гары,
Вось і восень на двары.
Вучым АЗБУКУ, сябры!




Старонкі 21–28.

ПАТРАБУЮЦЦА
КАМЕНШЧЫКІ
для працы ў Менскай вобласьці
АПЛАТА ЗЬДЗЕЛЬНАЯ
АД 1000 000
РУБЛЁЎ У МЕСЯЦ
ВЫПЛАТА 2 РАЗЫ НА МЕСЯЦ
тэл. у Менску (017) 259-17-65

## ПАШТОВАЯ СКРЫНКА

**Аўтару апавяданьня «Чатыры каты».** Падайце, калі ласка, сваё імя. Ваша апавяданьне хоча надрукаваць часопіс «ARCHE».

**Тлумачэньне.** У рэкляме на с.32 ужываецца слова «каменшчыкі», а не «муляры» на жаданьне рэклямадаўцы.

# А ты падпішыся!



**Каб рэгулярна атрымліваць «Нашу Ніву»,** проста паведаміце ў Рэдакцыю свой адрас. Адначасова Рэдакцыя зьвяртаецца з просьбай ахвяраваць на выданьне. Дэталі — **старонка 46.**

## ПРЫВАТНЫЯ АБВЕСТКІ

### ВІТАНЬНІ

**Віншую са сьвятам імянінаў** і з новай кватэрай самую зеленавокую і залатавалосую пражанку! Шчасьця табе, Натальканька! Сябар

**Віншую Алеся Мажвіда** з дэмбелем! Ліля

**Дзякуй Юліі Дарашкевіч** за фатаграфіі. Іван

### ВАНДРОЎКІ

**Зьміцер Касьпяровіч запрашае** ў вандроўкі.

Маршрут 1 (Амсьціслаўшчына) 10 верасьня.

Амсціслаўе—Ануфрыева—Пустынкі—Мазалава—Горкі.

Маршрут 2 (на сутыку Бераставіцкага, Гарадзенскага і Мастоўскага р–наў). 17 верасьня.

Лунна—Квасаўка—Індура—Масаляны—Вялікія Эйсманты—Малая Бераставіца—Вялікая Бераставіца.

Маршрут 3 (Ваўкавыскі р–н).

24 верасьня. Рось—Воўпа—Рэпля—Вярэйкі—Шылавічы—Мсьцібава—Гнёзна—Ваўкавыск.

Т.: 292–54–58, 622–57–20, 509–12–16

### КНІГІ

**Выдавецтва «Кнігазбор»** цяпер месьціцца па адрасе: вул.Рэвалюцыйная, 6а, 2 паверх, Менск. Т.:204–86–97.

Кнігу Францішка Аляхновіча «Выбраныя творы» яшчэ можна знайсьці ў менскай кнігарні «Сьветач».

**Падрыхтаваны энцыкляпэдычны** даведнік «Рэпрэсаваныя сьвятары». Каля 2000 біяграфіяў расстраляных або загіблых у сталінскіх канцлягерах сьвятароў зь Беларусі. Калі вам вядома што пра пакутнікаў або ёсьць магчымасьць паўдзельнічаць у праекце, тэлефануйце: 753–82–12, 755–25–61, (017) 211–09–53. Леанід Маракоў

### ТРАКТАР

**Куплю трактар МТЗ.** Т.: 179–34–67

## «НН» СТО ГАДОЎ З ВАМІ

**Жарты**

Сядзяць рыбакі ў карчме і вядуць гутарку, як калі здаралася самоў лавіць. Вось адзін і кажа:

— Памятаю раз пад вясну неяк злавіў я сома ў Бярозе, то блізка пяці пудоў быў!

А другі пад тое:

— Што гэта знача?! У нас у Дзьвіне злавілі раз сома, дык з аднаго языка тры пуды туку натапілі.

— А што, — перапыніў трэці, — каб ён тым языком ды брахануў? Вось бы мусі гладка выйшла?..

**«Наша Ніва». 1911. №31—32**

**Наша Ніва**
незалежная газэта
заснаваная ў 1906, адноўленая ў 1991
**галоўныя рэдактары «Нашай Нівы»:**
З.Вольскі (1906), А.Уласаў (1906—1914), Янка Купала (1914—1915), А.Луцкевіч, У.Знамяроўскі (1920), С.Дубавец (1991—2000).

| | |
|---|---|
| сакратарка рэдакцыі | Наста Бакшанская |
| галоўны рэдактар | Андрэй Дынько |
| фотарэдактар | Арцём Лява |
| нам.галоўнага рэдактара | Андрэй Скурко |
| мастацкі рэдактар | Сяргей Харэўскі |
| выдавец і заснавальнік | Мясцовы фонд выданьня газэты «Наша ніва» |

**АДРАС ДЛЯ ДОПІСАЎ:**
**220050, Менск, а/с 537**
**Tel/fax: (017) 284-73-29, 8-029-613-32-32, 8-029-707-73-29.**
**E-mail: nn@nn.by**
**On-line: www.nn.by**
© **НАША НІВА**.
Спасылка на «Нашу Ніву» абавязковая. 12 палос фарматам А2, 6 друк. арк. Друкарня РУП «Выдавецтва «Беларускі Дом друку». Менск, пр. Ф.Скарыны, 79. Рэдакцыя не нясе адказнасьці за зьмест рэклямных абвестак. Кошт свабодны. Пасьведчаньне аб рэгістрацыі пэрыядычнага выданьня №581 ад 4 ліпеня 2002 г., выдадзенае Міністэрствам інфармацыі Рэспублікі Беларусь. Юрыдычны адрас: 220030, г. Менск, вул. Калектарная, 20а–112. Р/р 3015212000012 у МГД ААТ «Белінвестбанк», Менск, код 764.
Наклад 2371. Газэта выдаецца 48 разоў на год.
Нумар падпісаны ў друк 23.00 30.08.2006.
Замова № 4828.
Рэдакцыйны адрас: Калектарная, 20а–112.